

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АДЫШОЎ ЯЦЭК КУРАНЬ ☞ 2

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 26 (2511) Год XLIX | Беласток, 27 чэрвеня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

У Падляшскім ваяводстве да 16 чэрвеня заяўкі на занясенне ва ўлік сельгаспадарчых вытворцаў падало 91% земляробаў, якія паводле апошняга сельскагаспадарчага перапісу абрабляюць па больш чым гектар зямлі, а з ліку апошніх 87,3% падалі заяўкі на даплаты, што складае 79,6% усіх звышгектарных гаспадарак...

Наша зямелька з краю?

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Хаця Польшча афіцыйна апынулася ў складзе Еўрасаюза 1 мая г.г., то ўжо з паловы красавіка павятовыя бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі прымалі ад земляробаў заяўкі на непасрэдныя даплаты да апрацоўванай зямлі. Такога яшчэ ў нас не бывала, таму і была праведзена грандыёзная падрыхтоўка да гэтага мерапрыемства, якое абяцае немалыя грошы. У маштабе Падляшскага ваяводства былі праведзены дзве з паловай тысячы курсаў, дзе шэсцьдзесят пяць тысяч земляробаў і каля шасці тысяч асоб з розных установ знаёміліся з правіламі запаўняння спецыяльных фармуляраў для сельскагаспадарчых даплат. У Бельскім павеце адбылося 330 курсаў для звыш сямі тысяч чалавек, у Беластоцкім — звыш 230 курсаў для 6,3 тысяч земляробаў, 26 курсаў для 555 школьнікаў і 9 курсаў для 186 служачых, у Гайнаўскім — 202 курсы для амаль пяці тысяч земляробаў і 62 курсы для 1 725 чалавек: вучняў сярэдніх і вышэйшых школ, настаўнікаў, страхавых агентаў, банкаўскіх работнікаў, ветэрынараў, геадэзістаў, павятовых і гмінных радных, солтысаў ды нават настаяцеляў!

Заяўкі мелі былі прымацца з 15 красавіка да 15 чэрвеня, аднак напярэдадні апошняга тэрміну быў ён адтэрмінаваны на два тыдні — да канца чэрвеня. Першыя заяўкі ад гаспадароў паступілі ўжо ў першы дзень іх прыёму, аднак найбольшы пік выпаў на панядзелак, 14 чэрвеня. У беластоцкім бюро ў гэты дзень было прынята звыш тысячы заявак, у Сямятычах 432, а ў Саколцы 553, калі ўжо 15 чэрвеня сакольскае бюро прыняло яшчэ 238 заявак, а 16-га — толькі 61. 70% усіх заявак з павета ўлічваюць даплаты з прычыны некарысных умоў гаспадарання, — паінфармавала Вераніка Блашко з сакольскага бюро. Найбольшая ў павеце заяўка паступіла з Янаўскай гміны — на амаль паўтары тысячы гектараў...

У Гайнаўскім павеце — як паінфармаваў кіраўнік тамашняга павятовага бюро Мікалай Яноўскі — найлепш пра даплаты да сваіх угоддзяў задбалі гаспадары з Чыжоўскай і Гайнаўскай гмін, дзе амаль усе земляробы, якія выступілі за занясенне ва ўлік сваіх гаспадарак, падалі заяўкі на даплаты. А вось, для прыкладу, у Белавежскай гміне, на тэрыторыі якой 642 звышгектарныя — зафіксаваныя на аснове сельскагаспадарчага перапісу 2002 года — гаспадаркі, за занясенне ва ўлік вытворцаў падалі заяўкі 135 гаспадароў, а за даплаты — 128 (да 16 чэрвеня).

У іншых паветах таксама былі разыходжанні. Па Сакольскім, Сямятыцкім і Бельскім паветах размежаванне праходзіла ў прынцыпе па мяжы Усходняй сцяны; кіраўнік беластоцкага павятовага бюро Яўген Семянюк не хацеў на гэты конт выказвацца — мо таму, што ён сам яшчэ нядаўна быў войтам самай усходняй гміны павета; ды і адмова выказвання гэта таксама свайго роду выказванне. У Сакольскім павеце найбольш актыўна пахадайнічалі за даплатамі земляробы Карыцінскай і Сухавольскай гмін.

У Бельскім павеце вылучылася гміна Браньск, у якой шмат вялікіх жывёлагадоўчых гаспадарак. У Сямятыцкім павеце за даплатамі найлепш пахадайнічалі гаспадары з Пэрлееўскай, Драгічынскай, Гродзіскай, Дзядковіцкай і Сямятыцкай гмін; апошнія гміны — Мельніцкая, Мілейчыцкая і Нурэцкая — гэта „хвасты". Але, як патлумачылі мне Тадэуш Невядомскі з Сямятыч і Юліта Гаўрылюк з Бельска, слабое зацікаўленне даплатамі ва ўсходніх гмінах згаданых паветаў не з'яўляецца вынікам нядбайнасці тамашніх земляробаў. Тыя землі пакінутыя гарадскімі нашчадкамі іх колішніх уласнікаў. Мабыць, ім не аплачваецца падымаць запушчаную бацькаўшчыну дзеля тых еўрасаюзных грашэй. Пра такіх жа белавежскіх „варшавякаў" згадваў і Мікалай Яноўскі.

У маштабе Падляшскага ваяводства, паводле стану на дзень 16 чэрвеня, заяўкі на занясенне ва ўлік сельгаспадарчых вытворцаў падало 91% земляробаў, якія паводле апошняга сельскагаспадарчага перапісу абрабляюць па больш чым гектар зямлі, а з ліку апошніх 87,3% падалі заяўкі на даплаты, што складае 79,6% усіх звышгектарных гаспадарак. Апошні паказчык — адсотак гаспадароў, якія падалі заяўкі на даплаты з ліку ўсіх уладальнікаў звыш гектарам зямлі — найменшы ў Гайнаўскім павеце — 64,7% і мала большы ў Беластоцкім — 65,3%. У гэтых двух паветах звыш трэці землеўладальнікаў, якія маглі хадайнічаць за даплатамі з еўрасаюзнага бюджэту, не пакарысталіся гэтым. Чарговыя з найменшых паказчыкі за Сямятыцкім (72,1%), Бельскім (75,9%) і Сакольскім (80,1%) паветамі. Найбольшыя паказчыкі ў Падляшскім ваяводстве за Граеўскім (96,4%), Кольненскім (92,2%) і Замбраўскім паветамі (91,3%).

І яшчэ адна цікавінка: у Падляшскім ваяводстве найменш заявак на занясенне ва ўлік сельскагаспадарчых вытворцаў падалі земляробы Беластоцкага (81%) і Сямятыцкага (84%) паветаў, а найбольш Замбраўскага (100%) і Граеўскага — 103%! Цікава, якая ў апошнім выпадку спрацавала хітрасць; парафразуючы геркаўскі лозунг — *powiat rośnie w siłę, bo ludzie chcą żyć dostatniej*?..

Сабраныя на палову чэрвеня заяўкі не даюць яшчэ поўнага ўяўлення пра структуру даплат. Пра гэта стане вядома пад канец ліпеня, калі павятовыя бюро Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі апрацуюць сабраныя заяўкі. Тады стане вядома не толькі колькасць самых даплат, але і структура кампенсацый за вырошчванне збожжавых і алейных раслін ды за некарысныя ўмовы гаспадарання.

Аляксандр Вярбіцкі

Сезон талентаў ☞ 2

Сакрат Янавіч

Бенефіс выдатнаму беларусу-праваслаўнаму зладзілі маладыя палякі-католікі. Кажу: маладыя, бо не ўяўляю сабе старых палякаў-беластоцкіх католікаў, якія дадумаліся б з публічным размахам ушанаваць „кацапа". Знакі нова-

Грэх адмаўлення ☞ 2

Мацей Халадоўскі

У Гайнаўскім павеце прысутнасць дасягнула ледзь 9,3%, у Бельскім — 13,8%, а найменш галасоў у рэгіёне было аддадзена ў гміне Дубічы-Царкоўныя — 6,7%. Размахванне лозунгамі некаторымі кандыдатамі, што ў Бруселі будуць змагацца за паправу жыцця на падляшскай Усходняй сцяне, ні на што не здалося, бо таксама і ніякія канкрэты на гэты конт не прагучалі...

Ціхне Семяноўка ☞ 4

Міра Лукша

Сярод моладзі ў святліцы — унучка Яна Мароза, смуглявая прыгажуня з марозаўскай радзіннай красой — Эвеліна Грондзель. Мабыць, яна з сябрамі пойдзе распытацца па людзях, ці не захаваліся дзе творы Яна Мароза, якая памяць у народзе аб найлепшым тутэйшым народным мастаку. Ці не знойдуцца яшчэ ў каго вобразы экзатычна-тутэйшай ягонай уявы? Найбольш улюбёным вобразам Мароза была хаціна ў пушчы...

Над Балтыкай ☞ 8

Ганна Кандрацюк

Ліцэісты знаёмяцца з творчасцю і асобай Джозефа Конрада, а таксама з культурай нацыянальных меншасцей, якія пражываюць у Польшчы. Сустрэліся ўжо з немцамі, літоўцамі, татарамі, жыдамі. Чаму спалучаем Конрада і меншасці? Пісьменік ставіў чалавека вышэй нацыянальнасці, веравызнання ці паходжання. Яго мышленне, так сказаць, было еўрапейскае. Мы хочам, каб моладзь умела знайсці супольную прастору паміж сваім светам і меншасцямі...

Запіскі кантрабандыста ☞ 10

Сымон Нальшанскі

Толькі прыдурак мог сцвярджаць, што эксплуатацыя чалавека чалавекам прыдуманая пануючымі класамі. Алік Гартанюк ніколі да такіх класаў не належаў. Ён быў самым звычайным кантрабандыстам. Як вядома з тэорыі класавай барацьбы, кантрабандысты ўвогуле ні да якіх класаў не належаць...

9 770546 196000

Вялікі палітык і добры чалавек

Кожны, хто сочыць за палітычным жыццём у Польшчы, даўно заўважыў адсутнасць Яцка Кураня. Хварэў некалькі гадоў, часцей прабываючы ў шпіталі чым дома. Вестка пра смерць Кураня шмат каму прыпомніла, як выглядаў свет палітыкі з яго ўдзелам.

Яцэк Курань, хаця ўвасабляў ідэйнасць рэвалюцыянера, мяняць рэчаіснасць імкнуўся шляхам маральнага ўздзеяння на тых, якіх лічыў вінаватымі ў несправядлівасці ці крыўдзе грамадству. Ад маладосці да канца сваіх дзён быў шчырым сацыялістам. У маладосці гэта абазначала канфлікт з тымі, якім сацыялістычная ідэалогія служыла інструментам для захопу ўлады, а пасля — зняволення грамадства. Членства ў камуністычнай партыі пазбавілі яго першы раз у 1953 годзе, калі Курань толькі пачынаў палітычную кар'еру. Не мог змірыцца з фальшам і крывадушнасцю сваіх таварышаў. У 1956 г. перакананы, што Гамулка стане ажыццяўляць сацыялістычныя ідэі, нанава стаў членам партыі. Аднак, на пачатку шасцідзесятых гадоў хутка пачалі вяртацца ўсе практыкі таталітарнай сістэмы. Курань, як ідэаліст, разам са сваім сябрам Каралем Мадзалеўскім напісаў адкрыты ліст кіраўніцтву партыі, у якім дамагаўся дэмакратыі і справядлівасці. У 1964 г. яго другі раз пазбавілі членства ў партыі. Для камуністычнай прапаганды стаў ён сімвалам рэвізіяніста, здрадніка, носьбітам чужой і варожай палякам ідэалогіі. Ліст быў таксама пачаткам яго дысідэнцкай дзейнасці.

У сакавіку 1968 г. сталі паказваць яго як аднаго з адказных за палітычны закалот у студэнцкім асяроддзі. Курань часцей прабываў у турме, чым на свабодзе. Зняволенне, як няраз гаварыў і пісаў, было для яго кашмарам. У пяцідзесятых і шасцідзесятых гадах змагаўся з рэжымам супраць пакарання турмой людзей за іх погляды і выказванні. Пратэсты заўсёды вялі яго проста ў турму. У 1970 г., калі збунтаваныя рабочыя на Памор'і выйшлі з фабрык на вуліцу, Курань заклікаў іх не паліць камітэты партыі, а толькі ствараць свае. Выказваўся супраць таго, каб на гвалт адказваць гвалтам.

Пасля чарговага бунту ў 1976 г. Курань стаў ініцыятарам Камітэта абароны рабочых. Арганізацыя займалася, перш за ўсё, дапамогай зняволеным па палітычных прычынах. Улады абвінавацілі Кураня ў спробе ліквідацыі сацыялістычнай дзяржаўнасці. Прапаганда паказвала яго як самага першага ворага Польшчы і палякаў, месца якога магло быць толькі ў турме. У зняволенні ў перыяд Народнай Польшчы Курань праседзеў каля 10 гадоў.

У час ваеннага становіча быў дарадчыкам „Салідарнасці". Яго канцэпцыя палітычнага змагання прывяла да эвалюцыйных змен у Польшчы, а пасля ва ўсёй Усходняй Еўропе. На пачатку дзевяностых гадоў Курань меў вялікі ўплыў на палітычнае жыццё ў Польшчы. Палякі маглі ў канцы пабачыць і пачуць чалавека, якога доўгімі гадамі прадстаўлялі як іхняга ворага. Паказаўся як міністр у джынсавай кашулі, які асабіста раздаваў суп людзям выкінутым на абочыну грамадскага жыцця. У тэлебачанні заклікаў грамадзян да чалавечай салідарнасці і дапамогі пакрыўджаным лёсам, у Сейме — да памяркоўнасці і службы грамадству. Не шукаў помсты за крыўды нанесеныя яму ў час камунізму. Але новы свет таксама не быў для такіх ідэалістаў як Курань. Дзяржава апынулася ў руках сарганізаваных груповак, якія наперамен бралі ўладу і дзялілі паміж сваіх грамадскую маёмасць.

Ад пачатку сваёй палітычнай легальнай дзейнасці Курань шмат увагі прысвяціў нацыянальным меншасцям. Па яго ініцыятыве былі ліквідаваны структуры ў Міністэрстве ўнутраных спраў, якія займаліся перш за ўсё кантролем насельніцтва няпольскай нацыянальнасці. Справы нацыянальных меншасцей апынуліся ў кампетэнцыі міністра культуры. У 1989 г. па ініцыятыве Яцка Кураня ўзнікла сеймавая Камісія па справах этнічных і нацыянальных меншасцей. Шмат гадоў быў ён яе старшынёю. Вядома тады было, хто ў краіне займаецца праблемамі грамадзян няпольскай нацыянальнасці. Адбываўся нейкі пастаянны дыялог паміж уладамі і нацыянальнымі меншасцямі. Калі ўзнікалі праблемы, Курань ангажаваў свой аўтарытэт у іх вырашэнне. Пасля яго адыходу з палітыкі ўсё вярнулася на кругі свае. Справамі непалякаў нанава сталі займацца ананімныя рэферэнты і афіцэры.

Хаця Курань ніколі не адклікаўся да хрысціянскіх вартасцей, але быў хіба адзіным палітыкам у Польшчы, які прадстаўляў сабою хрысціянскі падыход да грамадства і другога чалавека. Можа таму прафесійныя хрысціяне ставіліся да яго так непрыхільна. Курань імкнуўся спалучыць палітыку і маральнасць. Яму гэта ўдавалася, але, здаецца, нікому больш.

Яўген Мірановіч

Сезон талентаў



Скончыў я касіць траву каля хаты і, позна паабедаўшы з Таняй, засеў пісаць гэты тэкст у „Ніву". Пару днямі назад прыняў быў удзел у святкаванні сямідзесяцігоддзя Валодзькі Паўлючука з Рыбалаў, прафесара універсітэтаў у Кракаве і ў Беластоку. Не люблю такіх імпрэзаў, нудныя яны, манатонна-віншавальныя. Але Валодзькава гадавіна мяне зацікавіла (можа нават больш, чым яго самога).

Гэта была мне сустрэча з забытай эпохай, якая прадвызначыла беларускі лёс. Наш тут. Эпоха цяжкая, панурая, але ўспамінаецца яе сардэчна, як кожную маладосць.

Што змянілася праз паўвеку? Маладое пакаленне палякаў-католікаў і маладое пакаленне беларусаў-праваслаўных робяцца такімі самымі. Знікае тая сцяна, якая ўсё ўзвышаецца па інерцыі між пакаленнем маім з Валодзькам, а пакаленнем польскіх нам равеснікаў. Людзей падзяляе лёс, хлеб. Тое і тое нас цяпер так вельмі не адрознівае, як тады, у сярмяжную тую маладосць.

Характэрна, што сышліся да Валодзькі Паўлючука ў кафэ „Кабарэ" адны маладыя людзі, пераважна ва ўзросце нашых саракагадовых дзяцей; ужо жонкі-мацяркі і мужы-бацькі. Іх яшчэ не было на свеце, калі Валодзька абараняў доктарскую дысертацыю. Тых, хто знаходзіўся ў тую пару побач Валодзькі, з'явілася тры чалавекі, зусім зніклі ўшы ў шумнай публіцы.

Маё першае здзіўленне не тым, што Паўлючук у сваім пакаленні не існаваў, не існуе. Тлумна хіліцца да яго якраз інтэлектуальная стыхія дзяцей ды ўнукаў. Не толькі таму, што прыстойна адукаванае гэтае ўзыходнае грамадства. Важней, мабыць, тое, што ён даўно назваў і апісаў сённяшні час, аб непазбежнасці якога ніхто пры ім раней і не падумаў. Уладзімір Паўлючук у арэоле прарока! Сам ён нарагатаўся ў свой вечар у „Кабарэ", прыемна ашаломлены гэткім узвышэннем. Дакладней кажучы: весела здзіўлены, а што гарантуе яму маладосць мазгам у немаладым целе. Філосафы не старэюць.

Маё другое здзіўленне — гэта тым, што бенефіс выдатнаму беларусу-праваслаўнаму зладзілі маладыя палякі-католікі. Кажу: маладыя, бо не ўяўляю сабе старых палякаў-беластоцкіх католікаў, якія дадумаліся б з публічным размахам ушанаваць „кацапа". Знакі новага часу. У натоўпе чулася, таксама, беларускую мову і гэта нікога не здзіўляла прыкра. Нікому беларушчына не здалася нечым проціпольскім. Гэта трэба заўважыць і ўмець зразумець.

Адбываецца дзівоснае: толькі ў саветаў беларуская мова выклікае варожую рэакцыю; ідыёты абзываюць яе мовай фашысцкай, антынароднай, кулацкай (набраліся тухлых эпітэтаў, бы жаба балота). — Русский язык — это язык Ленина, язык коммунизма!

Натура часу нагадвае жывы арганізм, мае свой перад і свой зад. Паўлючук з Рыбалаў, былы актывіст мінулага часу, усё трымаецца наперадзе. Гледзячы на яго сівабародасць, прайшлі перад вачыма мае памяці шарэнгі твараў людзей, у асяроддзі якіх ён некалі жыў, дзейнічаў. Цяпер іх няма, хоць, магчыма, дажываюць свой век, карпеючы на эмерытурах у завулках новага часу. Валодзька як бы не думае пра іх, як рэдка калі падумаецца нам пра нябожчыкаў, памерлых ці жывых пакуль. Былі ў гісторыі Паўлючука і выдатныя чалавечыя адзінкі, якіх па сёння не забыўся, але няма пэўнасці, ці менавіта жывыя яны. Закон біялогіі, бы непадкупная смерць.

Маё трэцяе здзіўленне: Уладзімір Паўлючук выйшаў з багатага талентамі тлумнага пакалення вяскоўцаў у горадзе, выносячы ў сэрцы сум загуменняў, бліск чарадзейнага шкельца, знойдзенага на пастушыным выгане ў халоднае дзяцінства. Навальна звалiліся мы ў вялікі Беласток, пахаваўшы сялянскую культуру, голад і холад чалавечага прымітыву. Вёска мусіла загібець, як загібеў яе феадалізм, прапалі маёнткі з салоннымі палацыкамі, фартэпіянай музыкай ля расчыненых букетных акон, з беласукеннымі паненкамі ды франтаватымі кавалерамі. З фальклорнай вёскаю ўдалечыні.

Таленты заўсёды ёсць, але яны развіваюцца або не. Пэўнае тут адно: таленты губіць стабілізацыыя або і дабрабыт. Спакой. Шчасце. Шчаслівыя людзі не пішуць вершаў, не шукаюць сэнсу жыцця ні Бога. Усё Паўлючуковае пакаленне было пакаленнем нешчаслівых, смутным пакаленнем, што ратуецца ад лёсу бацькоў, лёсу паўфеадальнага. Свядомасць таго давала той эфект, што ніхто не хацеў заставацца мужыком, могучы стацца хоць падпанкам. Паспрыяла тады камуністычная нянавісць да сялянства як класа ўласнікаў.

Валодзька апісвае і даследуе тое, што было, а чаго як быццам ужо няма. Можа быць не ведаючы аб тым, што мінулае не прападае, толькі змяняе выгляд, прадметнасць. Вырастаючы ў перыяд цывілізацыйнае рэвалюцыі, раскалыхаліся ягоныя пачуцці ды інтэлект. Нарадзіся ён цяперашнім часам, стаў бы пэўна банальным эмігрантам у хлебным Захадзе... Гэта так: геніі паяўляюцца не па сваёй волі, чыніць імі іх талент плюс драматычная эпоха (нячастая). Гэта таму я, былы паўанальфабэт, бачу сёння мноства таленавітых маладых дактароў навук bez głodowych zaciekŏw na twarzy і ніводнага такога, хто мог бы параўнацца з Валодзькам з Рыбалаў, што жыве ў Беластоку.

Сакрат Янович

Вачыма еўрапейца

Грэх адмаўлення

Ну і першы раз выбралі мы дэпутатаў Еўрапарламента — дакладней, мізэрная частка тых, хто меў права на галасаванне. Палітыкі, сацыёлагі і палітолагі ламаюць сабе галовы, ад чаго такое марнае зацікаўленне. Прэзідэнт Кваснеўскі назваў такія выбарчыя паводзіны нават „грамадзянскай няспеласцю". Цяжка мне пагадзіцца з такім тэзісам. Палітычныя партыі, выбарчыя камітэты ўвогуле, а нават медыі мала зрабілі, каб растлумачыць грамадзянам, што гэта такое той Еўрапарламент, што ён можа і што Польшча з таго будзе мець. Некаторыя з палітыкаў, асабліва еўраскептыкі з-пад сцягоў Лігі польскіх сем'яў (LPR) ці Самаабароны тлумачылі, што будуць у Еўрапейскім парламенце абараняць польскія інтарэсы. Фактычна, аднак, парламент той практычна не мае ўплыву на тое, што дзеецца ў паасобных краінах-членах. На Падляшшы даслоўна на пальцах адной рукі можна было палічыць прэтэндэнтаў у Еўрапарламент, якія хоць спаглядалі б на нас з білбордаў. Найчасцей і ледзь не на кожным кроку паяўлялася юрыстка праф. Барбара Кудрыцкая, і то не толькі на кожным кроку, але і ў паветры, у якое ўзляцела на аэрастаце. І была карысць ад гэтага. Зваліла канкурэнцыю з ног, атрымаўшы 50 129 галасоў.

Гэтыя выбары былі не столькі прызначэннем нашых у Еўрапарламент, колькі выказваннем падтрымкі ці яе недахопам для таго, што тварыцца на лакальнай — польскай палітычнай сцэне. Усе групоўкі, якія здабылі падтрымку, маюць прадстаўніцтва ў Сейме і Сенаце, па-за Уніяй вольнасці, для якой гэтыя выбары былі першым сігналам вяртання з палітычнага выгнання.

Найбольшы грэх адмаўлення здзейснены ў адносінах да жыхароў вёсак і меншых мясцовасцей. У Гайнаўскім павеце прысутнасць дасягнула ледзь 9,3%, у Бельскім — 13,8%, а найменш галасоў у рэгіёне было аддадзена ў гміне Дубічы-Царкоўныя — 6,7%. Размаханне лозунгамі некаторымі кандыдатамі, што ў Бруселі будуць змагацца за паправу жыцця на падляшскай Усходняй сцяне, ні на што не здалося, бо таксама і ніякія канкрэты на гэты конт не прагучалі.

Да таго ўсяго да адмаўлення дапусціўся бок арганізатараў. Адчуў гэта нават епіскап Беластоцка-Гданьскі Іакаў. Як заўсёды, пайшоў прагаласаваць ва ўчастак, які „ад заўжды" месціўся ў Кураторыі асветы. Дзверы былі зачынены. Інфармацыя аб перанясенні ўчастка паявілася толькі пасля поўдня. Еўрасаюзных сцягоў у Беластоку не прыкмячалася, бо, як тлумачылі прадстаўнікі правага беластоцкага магістрата, не было іх „на стане". Агулам аказалася, што большасць з нас проста махнула рукою не так на самыя выбары ў Еўрапарламент, як на палітычны клас у Польшчы і не памаглі нават вядомыя твары спевакоў, акцёраў ці спартсменаў. Калі ўжо „не хацелася" (аб чым вядома было заранёў) і кандыдатам, і арганізатарам і, урэшце, электарату, быў адзін спосаб, каб прыцягнуць да урнаў. Следам Бельгіі, Люксембурга і Грэцыі трэба было аб'явіць выбары абавязковымі, пад пагрозай пакарання. У Польшчы, прачуленай, аднак, на любыя праявы „замардызму", выклікала б гэта масавыя пратэсты. Здаецца, з праблемай недастатковай прысутнасці найлепш справіўся італьянец Сільвіо Берлюсконі. У давыбарчую ноч будзіў ён сваіх землякоў, высылаючы ім SMSy, заклікаючыя іх да ўдзелу ў галасаванні. У Польшчы, нават калі хтосьці па справах г.зв. палітычнага маркетынгу пайшоў бы яго следам, то і так цяжка было б прымяніць такое. Як на злосць, ні прэм'ера ў нас няма, ні ўрада...

Маем, вось, польскіх еўрапарламентарыяў, без моцнай падтрымкі ва ўласнай краіне. Пяць найбліжэйшых гадоў пакажуць, ці дакажуць яны, што выбарчая пасіўнасць у тое 13 чэрвеня 2004 мела свае асновы.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Беласток са сваімі нацыянальнымі напругамі гэта дрэнны выбар. Самае адпаведнае месца для беларускай культуры — Вроцлаў...

Культура ў Вроцлаве

Пасля І Фестывалю беларускай культуры ў Вроцлаве не магу стрымацца ад думкі, што ў гэтак званым беларускім пытанні горад Беласток прамантачыў усё, што толькі можна было прамантачыць. А ў вас, паважаныя чытачы „Нівы", калі акуратна разгледзіце нумар, які перад вамі — можа скласціся падобнае ўражанне. Месцам прэзентацыі беларускай культуры становяцца любыя гарады Польшчы — Гданьск, Кракаў, Вроцлаў — абы толькі не Беласток... У Беластоку выхад беларускай культуры на агульнагарадскі форум чамусьці — можна тут пажартаваць — асацыюецца амаль са стратай незалежнасці Польшчай...

Праходзіў вроцлаўскі Фестываль беларускай культуры з 10 па 13 чэрвеня ў самім цэнтры горада, у якім арганізатары згусцілі і без таго багатую ды па краі набрынялую культурную прапанову (быць на ўсіх мерапрыемствах аказалася фізічнай немагчымасцю). Пачыналася жыхарам

Фота АЛЯКСАНДРА МАКСІМЮКА

Сцэнка з „Тутэйшых" Купалы

Вроцлава знаёмства з беларушчынай звычайна а 14 гадзіне і з гэтага моманту арганізатары ўжо „не адпускалі ўдзельнікаў" да позняй начной гадзіны, найчасцей было ўжо добра за поўнач, калі раздаваліся апошнія гукі канцэртаў. Арганізатары ж так паскладалі праграму Фестывалю, што ў адзін дзень на гледача-слухача „абвальваліся" разнастайныя па жанры мерапрыемствы — даклады, выстаўкі фатаграфій і жывапісу, канцэрты аўтарскай песні ды класічнай музыкі, тэатральныя пастаноўкі... Калі паглядзець на ўсё гэта не толькі з пункту погляду жыхара Вроцлава, але, напрыклад, з майго пункту, чалавека, які ўпершыню наведаў сталіцу Ніжняй Сілезіі, дык да ўсяго гэтага даходзіла яшчэ і знаёмства з надзвычайнаю красой горада ды ніжнесілезскіх краявідаў.

Арганізацыя Фестывалю, па словах галоўнага арганізатара і старшыні Калегіі Усходняй Еўропы Анджэя Дамброўскага, аказалася з ідэалагічнага пункту гледжання не зусім простай справай. Арганізатары, дзеючы ў рамках пагаднення аб сяброўстве паміж Гроднам і Вроцлавам, памкнуліся аб'яднаць у Фестывалі „афіцыйную" і „незалежную" культуру Гродна. Фестываль праходзіў менавіта з націскам на прэзентацыю Гродна, хоць у вроцлаўскіх галерэях паказваліся і мінскія мастакі. Памкненне гэткае ўдалося, бо побач прадстаўнікоў Гродзенскага гарвыканкама можна было ўбачыць гарадскіх дэпутатаў ад апазіцыі, рэдактара гродзенскай газеты „День" Міколу Маркевіча, ганаровага старшыню Саюза палякаў Беларусі Тадэвуша Гавіна, ды іншых. Гэтая разрозненасць на „афіцыйнае" і „незалежнае" выявілася і ў вонкавай атрыбутыцы, з якою абносіліся гродзенцы — адны мелі прышпіленыя значкі з зялёна-чырвоным сцягам, а другія — з бел-чырвона-белым.

Абачлівасць ды хітрасць арганізатараў праявілася ў агульнай формуле правядзення Фестывалю — над усімі мерапрыемствамі быццам лунаў сцяг „Фестываль беларускай культуры", але калі я прыгледзеўся дакладней, дык аказалася, што прэзентацыя часопіса незалежнага беларускага мастацтва „Partisan", даклады Сакрата Яновіча ды Тадэвуша Гавіна адбыліся ў рамках праекта Калегіі Усходняй Еўропы, які завецца „Academia Unius Europae".

— Я не думаю, каб Гарадскі савет Гродна, з якім мы падрыхтоўвалі Фестываль, так лёгка пагадзіўся на, скажам, Сакрата Яновіча ці канцэрт Віктара Шалкевіча ў праграме Фестывалю, — патлумачыў мне А. Дамброўскі, калі я запытаў яго, навошта было друкаваць дзве праграмы Фестывалю.

А вось, аказваецца, трэба было. Жыхары Вроцлава дзякуючы гэтаму маглі пазнаёміцца не толькі з вакальна-танцавальным калектывам „Белыя росы", але і даўняй музыкай эпохі Вялікага княства Літоўскага ў выкананні гурту „Стары Ольса"; побач канцэрта Камернага хору гродзенскай капэлы (велічны канцэрт у Праваслаўнай кафедры — была калі-небудзь вроцлаўская царква так шчыльна запоўненай?) выступіў у бібліятэцы Асалінскіх Віктар Шалкевіч, „на якога афіцыйнае Гродна так лёгка не пагадзілася б".

Акрамя ўжо названых мерапрыемстваў паказваліся ў Вроцлаве „Тутэйшыя" ў выкананні Гродзенскага лялечнага тэатра, адбыліся выстаўкі: фатаграфіі „Гродна мой горад", жывапісу і графікі гродзенскіх твор-

Фота АЛЯКСАНДРА МАКСІМЮКА

Выразак ніжнесілезскага краявіду — замак Ксёнж

Фота АЛЯКСАНДРА МАКСІМЮКА

Цэнтр горада бурліць жыццём круглыя суткі, чатыры дні ў гэтай абстаноўцы бурліла беларуская культура

цаў Юрыя Якавенкі, Сяргея Грыневіча, Аляксандра Сільвановіча і Валянціны Шобы ды сучаснага мастацтва творцаў з круга мінскага таварыства „Майстар" Аляксандра Фалея і Сяргея Крыштаповіча. Быў яшчэ канцэрт на класічную гітару ў выкананні Уладзіміра Захарава. Калі ідзе пра ўспрыманне вроцлаўскімі палякамі Купалаўскай п'есы, то трэба адзначыць, што яны досыць мужна вытрымалі канфрантацыю сваіх міфаў, з тым вобразам, які ім наканаваў беларускі класік. А вось уражальную выстаўку творцаў „Майстры" можна было глядзець дзякуючы садзеянню польскага пасольства ў Мінску, якое ў асобе ягонага сакратара Марыяна Семаковіча прывезла ў Вроцлаў карціны С. Крыштаповіча і А. Фалея.

Вроцлаў гэта яшчэ і краса горада ды краса ніжнесілезскіх краявідаў, як я ўжо і адзначыў у пачатку. Наконт красы горада самі жыхары выказваюцца досыць рэалістычна:

— Мы шмат чаго атрымалі ў спадчыну ад немцаў.

Немцы з'яўляюцца сёння моцна прыкметнай праслойкай турыстаў у Вроцлвае, якія безупынна наведваюць горад і гэтак жа безупынна

Фота АЛЯКСАНДРА МАКСІМЮКА

„Academia Unius Europae" — А. Дамброўскі і С. Яновіч

пакідаюць у ім свае грошы. Гораду ёсць за што дагледжваць сваю красу і не толькі... Грошы на Фестываль беларускай культуры дала Гарадская ўправа Вроцлава. Нічога дзіўнага таксама, што ўзнікаюць у горадзе такія ініцыятывы як Калегія Усходняй Еўропы — фонд, заснаваны па ініцыятыве Яна Новака-Езяранскага, мэтай якога ўзаемапаразуменне палякаў і іхніх усходніх суседзяў. Калі я спрабаваў заікнуцца, што Беласток усё ж больш падышоў бы да прэзентацыі беларускай культуры, мяне зразу абразумілі арганізатары Фестывалю:

— Беласток са сваімі нацыянальнымі напругамі гэта дрэнны выбар. Самае адпаведнае месца для беларускай культуры — Вроцлаў.

Што ж, я ўжо сказаў — Беласток прамантачыў сваё беларускае пытанне і факт гэты стаў вядомым у Польшчы. Адзначу толькі, што Калегія Усходняй Еўропы, акрамя гэтай першай прэзентацыі беларушчыны, правяла ўжо тры фестывалі прысвечаныя ўкраінскай культуры.

Вяртацца пасля поўначы з беларускіх канцэртаў у гасцініцу даводзілася доўга. Але той факт, што дарога так доўжылася быў крыніцай нечаканай асалоды — Вроцлаў бурліць жыццём усю ноч, не сціхае гоман яго пабаў, спеваў, начнога жыцця... Ужо ў першы дзень парцье ў гасцініцы мяне перасцерагаў — вы добра заплануйце свой час, у нас напраўду можна яго вельмі прыемна правесці...

Аляксандр Максімюк

Скупка лому

У мінулым у Чаромсе працавалі пукты скупкі бутэлек, макулатуры, лому ды другаснай сыравіны. У рыначнай эканоміцы мала хто адважыцца арганізаваць такія паслуговыя пункты, паколькі здзелка нерэнтабельная. У пачатках чэрвеня знайшоўся адважны і арганізаваў у Чаромсе пункт скупкі жалезнага і каляровага металалому. Знаходзіцца ён па вул. 1 Мая ў ранейшым ГСаўскім складзе апалу. Прадпрымальнік задбаў пра рэкламу і паразмяшчаў абвесткі ў навакольных вёсках. Рэзультату не трэба было доўга чакаць. Кліентаў хоць адбаўляй. Для многіх беспрацоўных у пасёлку гэта надзейныя дадатковыя грошы, якія здабываюць без падатку. Пахвала належыцца прадпрымальніку за гэта. Хацелася б, каб новаарганізаваны пункт скупкі металалому ў Чаромсе не стаў месцам продажу крадзеных рэчаў з дзяржаўнай чыгункі. Дарэчы, зараз чаромхаўскае асяроддзе будзе чысцейшым, паколькі кожны кавалак жалеза не будзе валяўся ў лесе ці на абочыне дарогі, але знойдзе месца на скупцы.

Уладзімір Сідарук

Мода на разводы

Ад 1 траўня адменены закон аб аліментацыйным фондзе. Зараз самотныя маці атрымоўваюць аліменты з Гміннай сацыяльнай дапамогі. Жанчыны пратэставалі супраць новых правіл, паколькі, па іх думцы, стаўка 170 зл. на дзіця не забяспечыць належных выдаткаў (дагэтуль стаўкі назначаў суд). Але новым законам пакарысталіся ўжо махляры і ашуканцы. Пайшла мода „на разводы". А вось як гэта выглядае. Шматдзетныя сужонствы падаюць у суд заяву на развод. Паколькі такое рашэнне атрымаюць, дык маці можа хадайнічаць за аліментамі, бо муж з'яўляецца беспрацоўным і не мае сродкаў на ўтрыманне дзяцей. У сапраўднасці сужонства пражывае ў адной кватэры як дагэтуль. Імкненне ўрада да эканоміі ў дзяржаўнай касе можа аказацца звычайнай асечкай, якой пакарыстаюцца ашуканцы. **(ус)**

Найстарэйшыя

У Нарваўскай гміне (Гайнаўскі павет) найстарэйшым жыхарам з'яўляецца 100-гадовы Васіль Трафімюк з Гародчына (нар. 13 чэрвеня 1904 года). На адзін год малодшая ад яго Марыя Астапкевіч (нар. у 1905 годзе), якая жыве ў Макаўцы. Чарговымі доўгажыхарамі з'яўляюцца Анна Алексяюк з Сацоў і Ян Тайгуноў з Трасцянкі, якія нарадзіліся ў 1907 годзе.

* * *

Нарваўская гміна налічвае 4,5 тыс. жыхароў. Паўтары тысячы асоб жыве ў Нарве.

Ад 1 студзеня да 15 чэрвеня 2004 года ў Нарваўскай гміне пажаніліся адзінаццаць пар. Нарадзілася 13 дзяцей і памерла 37 чалавек. Васемнаццаць пар будзе сёлета адзначаць 50-годдзе шлюбнага жыцця. **(яц)**

Два гады таму, калі пакінулі тут I-III класы, было 40 асоб. А ад 1 верасня — нікога. От і ўсё, такі знак часу. Лёсам асуджана наша школа. Усе тут моцна эмацыйна звязаны з ёю, цэнтрам асветы і культуры...

Ціхне Семяноўка

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Пра Семяноўку ў Інтэрнэце сотні звестак, матэрыялаў, артыкулаў. Пра вадасховішча, прыроду, чыгунку, на якой стаяла ўся ваколіца і далей, духоўныя справы, ёсць і адрас „зялёнай школы". А тая школа — зусім не зялёная, цагляная, двухпавярховая, з дабудаваным флігелем, што стаіць на грудзе зараз перад вадасховішчам, ад 1 верасня перастане існаваць як асветная ўстанова.

У святліцы-бібліятэцы

якая ад пачатку свайго існавання цесна супрацоўнічала са школай, жменька наведвальнікаў, у большасці — моладзь.

— Можа, калі б Майкла Джэксана запрасілі, то людзей прыйшло б больш, — кажа Галіна Панкоўская. Святліца самаўрадавая, утрымлівае яе Нараўчанская гміна. Практычна, на нішто грошай няма. 700 злотых у год — на закупку новых кніг. — Ёсць пастаянныя чытачы, якія, здаецца, прачыталі ледзь не ўсе кнігі. Галіна з Медзвядзёў бярэ па дваццаць кніг, Крашэўскага, здаецца, ці не пяты раз перачытвае. Вось, Раман, мабыць, усё прачытаў. Найбольш кніжак бралі вучні, асабліва з III і IV класаў. Мама прывядзе, мама адвядзе. Ёсць і школьная бібліятэка. А забралі да гэтай пары вучняў ад IV да VI класаў, цяпер, вось, і малыя пяройдуць вучыцца ў Нараўку... Здаецца, калісь час іншы быў. Людзі больш чыталі, і кніг, і газет. На „Ніву" на пошце падпісваліся. Пытанне да лістаношы, хто падпісваецца на „Ніву". Ніхто. А памятаю, якое свята ў школе было ў пятніцу, як валок ён у школу торбу поўную беларускага тыднёвіка. Мы ўсе перапісваліся з дзецьмі, чые адрасы друкаваліся ў „Зорцы", з усяго свету.

Тады пошта месцілася ў хаце Марозаў. Ян Мароз быў мастаком. Аб ім пісала „Ніва" ў адным з першых сваіх нумароў у 1956 годзе. На сценах святліцы Галіна Панкоўская стараецца

сабраць частку спадчыны Яна Мароза

— Мела я ідэю такую, каб пазбіраць ягоныя творы. Калісь амаль у кожнай хаце была яго алейная карціна ці маляваны дыван. Кажуць людзі, што шмат іх памарнавалася, ці выкінулі, ці трымаюць абы-дзе. Калісь была вялікая мода на Мароза. Людзі за карціну часта адраблялі — ці то ў капанне бульбы, ці ў жніво. Цяпер, калі пачулі, што ягонай спадчынай хтосьці цікавіцца, сталі шукаць, пытацца, колькі за гэта можна ўзяць. Частку выставы я ўжо змяніла, аддала пазычаныя карціны.

Сярод моладзі ў святліцы — унучка Яна Мароза, смуглявая прыгажуня з марозаўскай радзіннай красой — Эвеліна Грондзель. Мабыць, яна з сябрамі пойдзе распытацца па людзях, ці не захаваліся дзе творы Яна Мароза, якая памяць у народзе аб найлепшым тутэйшым народным мастаку. Ці не знойдуцца яшчэ ў каго вобразы экзатычна-тутэйшай ягонай уявы? Найбольш улюбёным вобразам Мароза была хаціна ў пушчы, у хаткі прыветліва свеціцца акенца, на небе — у залатым сяйве поўны месяц... Ідылія. Праз масток вядзе дзіцятка анёл-ахоўнік. А людзі хацелі часам пабачыць і шчасныя хвіліны закаханай пары — дама ва ўквечанай лодцы, лебедзь, на беразе — улан, на краяглядзе — муры таямнічага горада з залатымі дахамі ці зубатыя горы ў кучаравых хмарах. Варта адарвацца ад цяжкай работы, склаўшы рукі паглядзець на мастацтва, на карціну, за якую ты нарабіўся ў полі. Быў ты тады маладым, як і аўтар. У той цікавы час, ад якога ўсё змянілася. Людзі памятаюць.

Юрка Кіслы, гмінны радны, думкаю са школай

Моцны ў сваім лакальным патрыятызме, як гэта сам называе, хацеў бы, каб у школе, якая будзе цяпер „зялёнай", адвялі хоць маленькі куточак на тутэйшую гісторыю — і школы, і вёскі, у якой калісь пульсавала жыццё. У гэтай школе, пабудаванай за два гады, ад 1954 года, кагалам, у грамадскім пачыне, сам ён не вучыўся. Пасля вайны дзеці вучыліся ў чатырох хатах, пераходзілі з аднае ў другую. Дзе былі тыя школы? У Касцюковых (там, дзе Люба Мацкевіч, каля Мацеюка жыве), у Скепкі, у Аліфера, у Сахаркавых па-суседску. Вучняў было шмат. У новай школе класы налічвалі каля 30 асоб. Калі Тарнаполь дайшоў, дык у школе было за 150 вучняў. Два гады таму, калі пакінулі тут I — III класы, было тут толькі 40 асоб. А ад 1 верасня — нікога. От і ўсё, — кажа Юрка Кіслы, такі знак часу. Лёсам асуджана наша школа. Усе тут моцна эмацыйна звязаны з ёю, цэнтрам асветы і культуры. Памятаецца і пабудова, і разбудова, і будняе жыццё ды імпрэзы, і сустрэчы, нарады, і размовы. „Я ніколі не падыму рукі на яе ліквідацыю! — заклікаў быў Юрка Кіслы на адной з сесій. — Бо гэта было б падняць руку на святое!" На ягоную прапанову наконт тутэйшага музейчыка таксама ніхто не адклікнуўся. Мае тут быць *Instytut Zrównoważonego Rozwoju* і тая „зялёная школа". Добры тут аб'ект, над вадой, недалёка ад пушчы. За тым і ваяводскія вырашальнікі.

— Мы, ліцьвіны, такі рахманы, сціплы народ. Не тое, што падляшы. Напрыклад, на базары ў Гайнаўцы чутна іх гучная гамонка, а мы адзін да аднаго — паціхеньку. І ў нашай святліцы, калі раптам якая важная персона прыедзе, нашых і 30 асоб збярэцца, той госць таксама хай будзе і беларус, альбо ведае мову, дык усе — па-польску. Ніхто нас не асіміліюе-„вынарадаўляе", самі гэта робім. Свае правы аддаем без розыгрышу.

Міра Лукша

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Сабрацца, паразважаць аб культуры ў вясковай святліцы. Галіна Панкоўская — другая справа

Малая зацікаўленасць выбарамі

У Арлянскай гміне яўка выбаршчыкаў на выбарах дэпутатаў у Еўрапарламент была амаль найменшая ў Бельскім павеце (перадапошняе месца). Але гэта можна лічыць поспехам, калі ўлічыць еўрапейскі рэферэндум: тады Арлянская гміна заняла апошняе месца ва ўсім Падляшскім ваяводстве.

Арлянская гміна налічвае 3 700 жыхароў, з ліку якіх 3 165 асоб мае права выбіраць дэпутатаў. Але 13 чэрвеня пакарыстацца гэтым правам хацелася нямногім. На выбарчыя ўчасткі, хаця ў вёсках выбаршчыкаў чакалі школьныя аўтобусы, з'явілася толькі 314 чалавек, што склала 9,92% ад агульнага ліку выбаршчыкаў.

На тэрыторыі гміны працавлі чатыры выбарчыя ўчасткі — два ў самой Орлі і па адным у Дыдулях і Пашкоўшчыне. На выбарчым участку № 3 у Пашкоўшчыне, дзе членам выбарчай камісіі быў ніжэйпадпісаны, галасавалі жыхары Пашкоўшчыны, Тапчыкал, Кошак, Градалёў і Маліннік. На агульны лік 660 выбаршчыкаў прагаласавала толькі 45 чалавек. Жыхары вёсак, відаць, не хацелі пакарыстацца дармовым транспартам, бо з Маліннік на аўтобусе прыехала толькі 5 чалавек.

Самая вялікая яўка выбаршчыкаў была на ўчастку № 1 у Орлі — 12,43%. Адкуль такое малое зацікаўленне выбарамі?

— Выбары былі слаба распрапагандаваны, а выбаршчыкі не мелі магчымасці асабіста пазнаёміцца з кандыдытамі ў дэпутаты Еўрапейскага парламента, — лічыць сакратар гміны Ірэна Адзіевіч.

Апытаныя мною людзі найчасцей тлумачылі, што страцілі веру ў сілу выбарчага бюлетэня. Арлянскія выбаршчыкі галасавалі на амаль усе партыі — апрача Польскай нацыянальнай партыі і Агульнапольскага камітэта ОКО. У гміне перамагла Самаабарона — 74 галасы, з чаго Баляслаў Барысюк атрымаў 44 галасы. На другім месцы апынулася Польская сацыял-дэмакратыя — 52 галасы, з чаго 50 галасоў сабрала Анна Бурыла. Трэба адзначыць, што гэтыя два кандыдаты наведалі Арлянскую гміну. СЛД апынуўся на трэцім месцы з 45 галасамі (найбольш галасоў атрымала Зофія Транцыгер-Кочук). Варта адзначыць, што староста Бельскага павета, які балатаваўся са спіска Нацыянальнага выбарчага камітэта, атрымаў толькі 18 галасоў.

Міхал Мінцэвіч

„Белпрамбудбанк" у Варшаве

15 чэрвеня 2004 г. у Варшаве адбылася цырымонія адкрыцця прадстаўніцтва ААТ „Белпрамбудбанк".

Падчас выступленняў удзельнікі цырымоніі адзначалі значную актывізацыю беларуска-польскага гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва ў 2003-2004 гг. Па выніках 2003 г. абарот узаемнага гандлю паміж Беларуссю і Польшчай вырас на 60% і перавысіў паказчык у 780 млн. дол. ЗША, пры гэтым беларускі экспарт склаў амаль 435 млн. дол. З улікам паказчыкаў узаемнага гандлю паслугамі беларуска-польскае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва па выніках мінулага года дасягнула аб'ёму ў 1,2 млрд. дол. ЗША. Па выніках першых чатырох месяцаў 2004 года гандлёвы абарот вырас яшчэ на 47% і склаў 344 млн. дол., пры гэтым беларускі экспарт вырас на 52,6%.

У Беларусі рэалізуюцца інвестыцыйныя праекты з удзелам польскага і беларускага капіталу, у тым ліку стварэнне сумеснага прадпрыемства па вытворчасці аўтобусаў у Брэсце, шэраг праектаў у энергетычнай галіне і па рэканструкцыі беларускіх цукровых прадпрыемстваў.

Важкі ўклад у дасягнутыя высокія паказчыкі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ўносяць беларускія банкі. На сённяшні дзень у Польшчы дзейнічаюць прадстаўніцтвы чатырох буйнейшых банкаў — „Беларусбанка", „Белзнешэканамбанка", „Белінвестбанка" і „Белпрамбудбанка".

Падчас цырымоніі адбылося таксама падпісанне пагаднення аб крэдытна-інвестыцыйным супрацоўніцтве паміж ААТ „Белпрамбудбанк" і польскім „БРЭ Банкам". З удзелам капіталу згаданых банкаў будзе рэалізаваны інвестыцыйны праект па ўстаноўцы сучаснага абсталявання на Віцебскім камбінаце хлебапрадуктаў.

Прэс-служба Пасольства РБ

Каб не пасохлі нашы карані

Ганна Кандрацюк і Міра Лукша правялі цікавую размову з вучоным і літаратарам Уладзімірам Паўлючуком („Ніва" н-р 23). Цешыцца сэрца, што мы тут, на Беласточчыне, маем родную плеяду слаўных людзей, якія не адракліся роднага, якія вучаць нас, каб і мы не адракаліся свайго. Гэтыя адукаваныя людзі не жадаюць, каб іх хто вучыў па-чужому адносіцца да свайго роднага, як гэта адбываецца за мяжою ў гэтак званай Рэспубліцы Беларусь, і там, бадай, такіх людзей і не сустрэнеш, бо там іншы дух і патрэбы сэрца. Ды як жа можа быць там інакш, калі прэзідэнт краіны не карыстаецца роднай мовай?..

Чытаючы пра Уладзіміра Паўлючука, прыгадаў я ранейшы час, калі ён працаваў у „Ніве", а я пасылаў свае карэспандэнцкія допісы ў рэдакцыю. Перад маім вяселлем у лютым 1966 года я паслаў у „Ніву" запрашэнне, каб нехта з рэдакцыі (у першую чаргу Георгій Валкавыцкі або Міхась Хмялеўскі) прыехаў на маю ўрачыстасць. Скора атрымаў цёплы ліст з падзякай і пажаданнямі ад спадароў Валкавыцкага і Хмялеўскага, аднак яны заявілі, што з прычыны занятасці яны не змогуць прыехаць, але прыедзе да мяне Уладзімір Паўлючук. Я быў захоплены і чакаў дарагога госця. Аднак, відаць, нешта і яму перашкодзіла прыехаць на маё вяселле.

І зноў сэрца цешыцца, што колішні працаўнік „Нівы", сённяшні літаратар і вучоны, не забыў свайго роднага і цёпла ўспамінае сваю ранейшую працу, з якою расстаўся не па сваёй віне. Вельмі добра, што спадар Паўлючук напісаў шмат цікавых кніг і навуковых прац. Усе гэтыя кнігі павінны быць выдадзены і на беларускай мове, а ўжо абавязкова „Юда", так як на абедзвюх мовах слаўная „Пожня" пяра Васіля Петручука. Я маю сардэчную просьбу да прафесара Уладзіміра Паўлючука, каб чарговыя кнігі пісаў ён па-беларуску, каб нашы родныя карані не высыхалі. Бо калі мова — гэтая жывая вада — загіне, дык засохне і наша гісторыя, а нам будзе хана.

Мікалай Панфілюк

Людзі ў новым выданні

Адна з самых важных праблем, якую можна наглядаць сярод беларусаў Беласточчыны, гэта, на жаль, касмапалітызм і прагрэсіруючая асіміляцыя да польскай культуры. Гэтая адмоўная для абедзвюх нацый з'ява рухаецца, на жаль, уперад. Асіміляваныя асобы з характэрнай неафітам руплівасцю змагаюцца са сваім ранейшым увасабленнем ува ўсіх яго праявах і заядла пачынаюць спавядаць новую веру. Намагаюцца яны стаць суперпалякамі і суперпатрыётамі. Са звычайнага чалавека пераўтвараюцца ў ягоную карыкатуру. Нават да Бога пачынаюць прамаўляць на іншай, чужой мове ў спадзяванні, што Той не пазнае іхняга адрачэнства.

На Беласточчыне, на жаль, такіх людзей надта многа. Гэта праз іх ускладняюцца ўзаемныя польска-беларускія адносіны. Гэта ім беларуская мова перашкаджае ў школе, царкве, на вуліцы, гэта яны хацелі б сцерці кожны след свайго паходжання. Падсвядома адчуваюць, што робяць яны дрэнную справу, паганую, якая не адабраецца новым асяроддзем. Хаваюцца яны пад шыльдай „праваслаўных" або запісваюцца ў ультранацыянальныя польскія арганізацыі, быццам няпэўныя свайго новага статусу. Гэтыя людзі ў новым выданні Польшчы і палякам зусім непатрэбныя.

У нашай польскай гісторыі, на жаль, поўна такіх асоб. XVII стагоддзе гэта інкубатар нованавернутых беларусаў, якія сталі новымі палякамі. Толькі да сённяшняга дня мы не можам справіцца з іхняй спадчынай. Адно, што ім напэўна ўдалося, гэта перасварыць між сабою абедзве нацыі.

Гэтую праблему, мабыць, заўважылі каталіцкія ксяндзы на Беларусі, якія, як я заўважыў на месцы, намагаюцца надаць Каталіцкаму касцёлу мясцовы, карэнна беларускі характар. Гэта вельмі суцяшальны факт. Праваслаўная царква на Беласточчыне і каталіцкая іерархія, як мне здаецца, завязлі ў часах падзелаў Рэчы Паспалітай і не заўважылі, што побач сябе існуюць беларуская дзяржава і свабодная Польшча. Гэта вялікая страта для беларусаў, беларускай мовы, культуры і для ўзаемаадносін.

Здзіслаў Ліпскі

Чаму так мала?

Пасля нядзельных выбараў ў Еўрапарламент, многія палітыкі задумоўваліся, чаму польскае грамадства праявіла так малое зацікаўленне выбарамі. Нават сам прэзідэнт Кваснеўскі здзіўлены выказваўся ў тэлебачанні, што людзі хіба не бачаць таго ўсяго, што нам дасць Еўрасаюз.

На маю думку, многа нам дасць Еўрасаюз, дагоніць і яшчэ раз дасць! Толькі каб мы ўсё тое вытрымалі. Здаецца мне, што цяпер грамадства намнога збяднела і ўжо не верыць нашым палітыкам ні левым, ні правым. Калі кампенсавалі пенсіі пенсіянерам, яны павысіліся ў сярэднім каля 10 злотаў у месяц. На колькі больш у той час былі павышаны цэны харчовых прадуктаў, будаўнічых матэрыялаў і паслуг. З-за таго, думаю, наша грамадства стала намнога бяднейшым, так што цяпер не будуць прыгажэць вёскі. А калі стане развальвацца агароджа, дык пенсіянеры будуць яе разбіраць і паліць ёю ў печках і так паўстануць вёскі без платоў, як калісьці калгасы ў Савецкім Саюзе.

Прычынай нізкай яўкі на выбарах у Еўрапарламент з'яўляецца тое, што наша грамадства перастала верыць палітыкам. Абкрадала дзяржаву АВС, калі кіравала краінай. Пабачыўшы, што ўжо астаюцца без выхаду, яны пачалі дзяліцца і ствараць новыя правыя партыі. Таксама цяпер левыя палітыкі, бачачы канец кіравання дзяржавай, пачалі дзяліцца між сабою і стварылі новую партыю. Бачаць грамадзяне і тое, што за карупцыю ў краіне няма віноўных. Нашыя палітыкі і высокія рангам чыноўнікі, хаця і вінаваты, то няма каму за гэта адказваць. Не будзе добра, калі дзяржавай надалей будуць кіраваць такія аслы.

Мікалай Лук'янюк

У Трасцянцы

Цяпер у Трасцянцы сельскую гаспадарку пачаў развіваць Веслаў Катовіч са сваім зяцем Грынявіцкім. На канцы вёскі, з боку Заблудава, ён разбудоўваецца і кожны кавалак аблогу стараецца абсеяць. Гадуе гусей, а таксама спецыяльную пароду кароў, якіх не дояць і яны не баяцца марозу. Гадуе на продаж. Мясцовыя людзі называюць яго баўэрам, цікава толькі як доўга вытрымае ён у такіх умовах, ці можа абанкруціцца як колішнія калгасы, а пасля ўсё гэта возьме ў свае рукі нейкі баўэр з еўрасаюзнай краіны?

Высакаякасныя сенажаці ўздоўж ракі Нарвы ляжаць аблогамі, ніхто імі не цікавіцца, і, як кажуць старыя людзі, цяпер над ракой смела могуць вадзіцца ваўкі, бо ніхто туды не заглядае. Калі параўнаць цяперашнюю Трасцянку з тою з сямідзесятых гадоў, дык намнога яна змянілася, папрыгажэла. Няма пустых хатаў, іх купілі гараджане. Вяртаюцца таксама на бацькаўшчыну дзеці ды ўнукі і прыгожа рамантуюць хаты. Яны прыязджаюць сюды на уік-энды ды летам на канікулы са сваімі дзеткамі. **(мл)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

ЗОРКА

для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Усяго пакрыху” з апякункамі Валянцінай Андрасюк (першая справа), Барбарай Юрчук і Хрысцінай Койла

У сонейка ў гасцях

Тэатральны гурток з Чыжоў, які завецца „Усяго пакрыху”, існуе адзін год. На сёлетнім тэатральным аглядзе Чыжы заваявалі першае месца. Колькі было радасці! Цешыліся акцёры і настаўніцы-апякункі ды сам дырэктар чыжоўскай школы, які таксама прыехаў на агляд.

— Гэтая ўзнагарода вельмі нас падмацавала духам, — кажа Валянціна Андрасюк, апякунка групы. Разам з ёю гуртком займаюцца Барбара Юрчук і Крысціна Койла. Апошняя — менеджэр калектыву.

— Усе рэквізіты і касцюмы мы робім уласнаручна, — расказвае пані Валянціна, — разам апаражняем шафы з непатрэбшчыны. Працуем з радасцю, цешымся, калі нешта пачынае атрымлівацца.

Школьныя акцёры, — як кажа настаўніца, — гэта дзеці са святліцы з I-III класаў. Сустракаюцца кожную пятніцу пасля ўрокаў. Гурток рыхтуе п’есы на польскай і беларускай мовах. Паказвае іх пасля на школьных урачыстасцях. Свой дэбют мелі на трыццацігоддзе школы. Пасля падрыхтавалі сцэнку на ёлку — па-беларуску.

У Гайнаўку прыехалі са спектаклем пад загалоўкам „У сонейка ў гасцях”. Гэта адаптацыя народнай казкі.

— Сцэнарый мы вышукалі ў „Пралесцы”, але яшчэ і самі дапісалі некалькі роляў. Таксама наша песня, музыку да яе стварылі ў нашым вакальным калектыве „Праменьчык”, — кажа Валянціна Андрасюк.

Ужо да выступлення чыжоўскія акцёры кідаліся ў вочы. Іх *касмічныя* касцюмы — Сонейка, Месяца і зорак — прыцягвалі ўвагу. А „Вожык”, які цэлы дзень хадзіў з пастаўленымі на гель валасамі, выклікаў незвычайнае зацікаўленне дзяўчат з іншых школ!

Тут таксама была і ўзнагарода для найлепшай акцёркі. Журы ўзнагародзіла Паўліну Башун за ролю „Сарокі”.

Пра што ішло ў п’есе? — спытаеце. Пра надвор’е. Лясная звярына і птушкі, якім надакучыла халадэча, прасілі ў сонейка цёплага лета.

Як жа актуальныя словы чыжоўскіх тэатралаў. Зараз, калі пішу гэтыя словы, за акном хмурны чэрвень. Міжволі ў галаве адна мара — хай бы настала летняя спёка!

Ганна Кандрацюк

Вершы Віктара Шведа

Геаграфічны атлас

Атлас геаграфічны ўнуку
Бабуля падарыла.
— Будзе патрэбны да навукі,
Навука — гэта сіла!

Калісь, як я была малая,
Патрэбны быў у класе,
— Ці ўжо на ім, — унук пытае, —
Амерыка знайшлася?

Зязюля

Настаўнік запытае
Улю малую:
— Птушка якая
Гнёзд не будуе?

— Гэта зязюля, —
Адказвае Уля. —
Жыве заўсёды
У гадзінніках модных.

Пчолка

Калісьці ўсе пушчанскія звяры жылі ў вялікай згодзе. Часта збіраліся разам на якой-небудзь паляне на свае звярыныя сходы-зборы, таксама і ў госці хадзілі адзін да другога. Але здарылася вось што.

Аднойчы хлопчык з пушчанскага хутара гнаў пасвіць коз. Статак ішоў спакойна датуль, пакуль не апынуўся на дарожцы каля агародаў. Козы, як толькі звочылі маладую капусту, адразу — скок! і ў агарод, і да капусты. Кінуўся пастушок, каб іх адтуль выгнаць. Гоніць, гоніць і выгнаць не можа. Ядуць козы капусту і на нішто не зважаюць. Сеў хлопчык на мяжы і горка заплакаў.

Бег узмеж агародаў зайчык, прыкмеціў хлопчыка, як той плача, зжаліўся над ім:

— Чаго плачаш, хлопча?

— Як мне не плакаць! — скрозь слёзы той кажа. — Бачыш, улезлі козы ў капусту і аніяк не магу іх выгнаць.

— Не плач, зараз жа я іх выганю, — яму зайчык на тое.

— Ой, не выганіш, — сумняваецца пастушок. — Гэта ж надта непаслухмяныя козы.

— Але як крыкну, як тупну, — дык адразу паслухаюцца — заганарыўся зайчык і паклыпаў да козаў.

Ганяў зайчык коз, ганяў і аніяк выгнаць не можа. І крычаў, і тупацеў, а козы на яго і ўвагі не звяртаюць: ядуць капусту, ажно бароды ў іх трасуцца. Сеў зайчык каля хлопчыка і таксама заплакаў.

Бегла ўзмежкам ліса, звочыла зайчыка ды пытаецца:

— Чаго плачаш, зайчык?

— Плачу я, бо хлопчык плача, а хлопчык плача, бо коз з агарода выгнаць не можа.

— Не плачце, — суцяшае іх ліса. — Я іх зараз жа выганю.

— Ой, не выганіш іх, ліска, бо гэта надта ж упартыя козы, — не верыць зайчык. — Хлопчык выганяў і не выгнаў, я выганяў і не выгнаў, дык і ты тым болей не выганіш. Гэта вельмі непаслухмяныя козы.

— Ну-у-у! Што там тыя козы, даволі мне хвастом махнуць — разбягуцца, — зафанабэрылася лісіца і паімчала да коз.

І хвастом махала, і голас падымала, але ўсё дарма — цярэбяць козы капусту, аж пошчак па агародзе разыходзіцца.

Села лісіца каля зайчыка і таксама заплакала.

Шнырыў каля хутара воўк, заўважыў, што лісіца слязьмі заліваецца, запытаўся ў яе:

— Чаго плачаш, ліска?

— Плачу я, бо зайчык плача, зайчык плача, бо хлопчык плача, а хлопчык плача, бо коз з агарода аніяк выгнаць не можа.

Час рыцараў

Сярэднявечча. Дзе пачатак — дзе канец?

За пачатак сярэднявечча гісторыкі лічаць 476 год, калі падае Рымская імперыя. Але яе ўсходняя частка са сталіцай у Канстанцінопалі ператрывае яшчэ тысячу гадоў! Гэты горад перамогуць туркі толькі ў 1453 годзе. Ёсць меркаванне, што менавіта тады канчаецца сярэднявечча.

Іншая дата канца эпохі — 1492 год, калі Хрыстафор Калумб адкрыў Амерыку і даказаў, што свет большы, чым людзі думалі.

Пушча і жыхары

На пачатку сярэднявечча ў большай частцы Еўропы (і на нашай зямлі) панаваў лес. Непраходная пушча. Населеныя пункты выглядалі як астраўкі сярод мора дрэў. Камунікацыйнымі шляхамі былі рэкі і азёры. Цяжка ўстанавіць прыблізную колькасць жыхароў. Вядома, што з X па XIII стагоддзе лік жыхароў Еўропы падвоіўся з 30 да 70 мільёнаў. Пасля пошасці чумы лік жыхароў гвалтоўна паменшыўся. Пад канец XIV ст. у Еўропе пражывала 45 мільёнаў людзей, значыць, за чатыры разы больш чым сёння ў Беларусі.

Большасць людзей пражывала ў вёсцы. Гарады былі малыя, толькі нямногія налічвалі тады да 10 тысяч жыхароў. Сапраўднымі вяліканамі лічыліся Венецыя, Парыж, Канстанцінопаль — 100-тысячныя гарады.

У Беларусі самымі знатнымі гарадамі былі Полацк, Навагрудак, Віцебск, Тураў, Пінск і Бярэсце.

На нашых падляшскіх землях — Драгічын, Бельск, Крынкі, Кнышын, Сураж.

(працяг будзе)

(гак)

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Звычайная капанька можа служыць як паднос

Польска-беларуская крыжаванка № 26

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 22: Мак, слова, касміт, святы, лета, Ас, гітара, Нарва, гара. Асліца, свет, смятана, літара, боты, ара, вадаспад.

Узнагароды — **каляровыя даўгапісы** — выйгралі: **Эвеліна Гайко** з Бельска-Падляшскага і **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

Ахрымы ў гміне Нараўка

У Лядскай пушчы над рэчкай Нараўкай распаложана вёска Ахрымы. Заснавана яна была ў 1775 годзе, а сваю назву ўзяла праўдападобна ад імя Ахрым (Ефрем). Перад пацыфікацыяй у вёсцы было 30 гаспадарак, пражывала тут 280 жыхароў. 2 жніўня 1942 года гітлераўскія жандары з паста ў Нараўцы перасялілі людзей з Ахрымоў у Старое Ляўкова. Іхнюю маёмасць зрабавалі, а будынкі разбурылі. Адбудаваная пасля вайны вёска налічвала 36 гаспадарак і 250 жыхароў (1979 год). Зараз у вёсцы жыве 116 чалавек.

Легенда гаворыць, што над рэчкай Нараўкай жыў пан. Меў ён вялікі двор і многа падданых. Усе ведалі вясёлага і працавітага Ахрыма, якому не падабалася гэткая служба. Ён быў свабодалюбівым і гордым чалавекам. Усім было вядома, што ў гэта-га пана быў такі звычай, што калі хто ўцёк праз глыбокую рэчку, пан ужо яго не шукаў. Ён лічыў, што падданы загіне ў суровай пушчы.

Калі Ахрыму абрыдла служба, ён дамовіўся са сваім сябрам і яны задумалі ўцячы. Ноччу пераплылі рэчку і падаліся ў глыб пушчы. Хутка, аднак, вярнуліся на бераг і там пачалі будаваць сабе хату. Пан не загадаў ім вяртацца, бо ведаў, што яны адважныя людзі і хочуць жыць самі.

Што было з імі далей, ніхто не ведае. Вядома толькі, што мелі яны дзяцей, унукаў, праўнукаў. У гонар першага жыхара вёску, якая там узнікла, назвалі Ахрымамі, а яе жыхароў — ахрымюкамі. На месцы (непадалёк Новага Ляўкова) дзе жыў пан, засталася зараз толькі маленькая сажалка і старая хатка.

Уладзіміра АХРЫМЮКА выслухала Малгося АХРЫМЮК

— Не плачце, — храбрыцца воўк, — я іх мігам выганю.

— Ой, не выганіш іх, воўча, бо гэта надзвычай шкодныя козы: хлопчык іх выганяў, і не выгнаў, зайчык выганяў і не выгнаў, я таксама не змагла выгнаць.

— Што-о-о! Даволі як раз зубамі скрыгану або пашчу разяўлю — адразу ўцякуць. — Выхваляўся воўк ды скочыў да коз.

І зубамі скрыгатаў, і пашчай ляскаў, нават выць пачаў, а тыя козы ні глядзець, ні слухаць яго не хочуць: глушаць капусту ды з воўка насміхаюцца.

Сеў воўк каля ліскі і зарыдаў са злосці.

Па-над агародамі ляцела маленькая пчолка. Убачыла яна, як воўк слёзы пралівае, пытаецца:

— Чаго плачаш, воўча?

— Плачу я, бо ліса плача, ліса плача, бо зайчык плача, зайчык плача, бо хлопчык плача, а хлопчык плача, бо коз з агарода аніяк выгнаць не можа.

— Прыкрая справа, — засумавала пчолка. — Трэба ж, аднак, з бяды ратавацца. Паспрабую я выгнаць іх.

— Ты? — здзівіліся звяры і раптам, забыўшыся пра сваю горкую бяду, зарагаталі на ўсё горла.

Аднак пчолка не збянтэжылася. Падляцела яна да першай казы і — „бзом!" — ёй у вуха. Шмыганула да другой і таксама — „бзом! бзом!". Закруцілася і каля трэцяй — „бзом! бзом! бзом!". Гэтак усім козам у вушы набзыкала. Застрыглі козы вушамі, затрэслі галовамі, задзерлі свае куртатыя хвасты ды далі драла з агарода.

Звярам аж не па сабе стала, што маленечкая пчолка паказала сябе мацнейшай за іх, вялікіх. Разбегліся яны хто куды ад сораму і па сённяшні дзень не сыходзяцца разам.

Кажуць, што з таго часу каля Белавежскай пушчы ніхто ўжо коз не трымае. Пастушкоў таксама даўно там няма.

Мікола ГАЙДУК, „Белавежскія быліцы і небыліцы"

Купалле

Ноч кароткая гуляе.
Зоры ў небе, зоры ў душах.
Ноч смяецца, ноч спявае,
Ноч старыя формы зрушыць,
Спалымнее. Мілаванне
Усіх з'яднае, у прыродзе.
Будзем цешыцца да рання
У купальскім карагодзе.
Хто здабудзе раптам шчасце?
Знойдзе папараці кветку?
Адкрываем сэрцы насцеж
Людзям, ветрыку і летку...

Міра ЛУКША

Нас ашарашыла публіка — на сустрэчу прыйшло больш за сотню моладзі. На століках — адбітыя на ксераксе „Вершы тутэйшыя”, „Ніва” і інфармацыі пра беларускую нацыянальную меншасць...

„Тутэйшыя” над Балтыкай

— Ёсць можа ў вас нейкія *zegareczki*? — пытаем ва ўсіх кіёсках на навюткім вакзале ў Беластоку.

— Не — не маем...

Мы таксама махаем рукой і апошнія хвіліны перад ад'ездам цягніка праводзім у бары. На наш столік ставяць боршчык з маладога шчаўю. Свойскі, з яечкам і кіслай смятанай. Наядаемся на тры дні.

— Бо там жа ж не будзе такога смачнага...

Разам з паэтэсай Мірай Лукшай збіраемся ў Гданьск. Едзем, — як кажа Міра, — дзеля беларускай справы. Яе словы пацвярджае канкрэт — наплечнік з беларускімі кніжкамі і часопісамі, разам каля трыццаці кілаграмаў.

І місія ў нас канкрэтная — Міра едзе на аўтарскую сустрэчу. Будзе чытаць свае „Вершы тутэйшыя” для тамтэйшай моладзі. Я таксама ў канкрэтнай ролі — еду як гід, цеаахоўнік і летапісец паэтэсы.

У рэдакцыйна-місіянерскім закалоце забываемся пра гадзіннікі і мабільныя тэлефоны.

— А маеш хоць „Вершы тутэйшыя”? — пытаю на ўсякі выпадак Міру.

— Здабыла адзін экземпляр, — чую трыумфальныя словы. Бо „Вершы тутэйшыя” разышліся як свежыя булачкі і кнігу трэба шукаць па людзях. Тыя, што на сваёй спіне цягне паэтэса — кніжкі сяброў і знаёмых. Дваццаць-трыццаць загалоўкаў.

* * *

— Я думала, што ўжо не дажыву такога, каб на сустрэчы з паэтам пабачыць жаўнераў, — шапчу на вуха Міры.

Сядзім за ганаровым сталом у чытальнай зале. Перад намі дзяўчаты і хлопцы ў матроскай форме. У мяне ўсё больш хвалявання — тут падазрона цудоўна. Сустрэчу вядзе Аляксандр Юрэвіч — паэт і празаік, аўтар маёй любімай „Балады пра сапраўднае каханне”.

— Большасць герояў „тутэйшых” я ведаю асабіста, і маю нават такое ўражанне, — кажа Юрэвіч, — там ёсць вершы і пра мяне. Сярод герояў я сустрэў *Аліка* — так называлі мяне ў хаце.

Аляксандр Юрэвіч нарадзіўся ў Лідзе на Гродзеншчыне. У пяць гадоў, разам з хваляй рэпатрыянтаў, з'ехаў у Польшчу. Як піша ў аўтабіяграфічным рамане „Ліда” — у дзяцінстве не мог зразумець, чаму мясцовыя палякі называлі іх *кацапамі*. Дарэчы, у „Лідзе” польская мова пераплятаецца з беларускай. Так гутараць між сабой бацькі галоўнага героя.

Прысутнасць беларускай стыхіі прамаўляе таксама са сцен чытальнай залы, дзе красуецца фотавыстаўка пра Лідчыну і яе жыхароў. Выстаўку прывёз сейненскі Асяродак культур „Pogranicze”.

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Справа: Аляксандр Юрэвіч, Міра Лукша, Моніка Малеса-Драгамірэцкая, аўтарка

* * *

Нас ашарашыла публіка — на сустрэчу прыйшло больш за сотню моладзі. На століках — адбітыя на ксераксе „Вершы тутэйшыя”, „Ніва” і інфармацыі пра беларускую нацыянальную меншасць.

— Праект накіраваны да ліцэйскай моладзі з трыгарада Гданьск-Гдыня-Сопат, — кажа арганізатарка сустрэчы Моніка Малеса-Драгамірэцкая. — Ліцэісты знаёмяцца з творчасцю і асобай Джозефа Конрада, а таксама з культурай нацыянальных меншасцей, якія пражываюць у Польшчы. Сустрэліся ўжо з немцамі, літоўцамі, татарамі, жыдамі. Чаму спалучаем Конрада і меншасці? Пісьменік ставіў чалавека вышэй нацыянальнасці, веравызнання ці паходжання. Яго мышленне, так сказаць, было еўрапейскае. Мы хочам, каб моладзь умела знайсці супольную прастору паміж сваім светам і меншасцямі.

На жаданне мы з Мірай распавялі пра „Ніву” і Сустрэчы „Зоркі”. Дапамагала згаданая фотавыстаўка з Лідчыны. Там гарадская моладзь гутарыць з бабулямі і дзядамі ў беларускай вёсцы. Як у нас. Тым больш, што дзейнічала цудоўная выпадковасць. Бо Сустрэчы „Зоркі” пачаліся менавіта ад „Пагранічча”.

— І як было? — пытаюцца зараз у Беластоку. — Як успрыняла вас польская моладзь?

Трэба сказаць праўду. Мы адчувалі, што па другім баку першы раз у жыцці пачулі пра нейкіх беларусаў.

Тут дапамаглі нам гданьскія сяродзічы, якія з гумарам і фантазіяй апавядалі пра адрозненні паміж палякамі і беларусамі. Аказалася: мы добрыя, сумленныя, таленавітыя, і неабавязкова ўсе праваслаўныя.

* * *

З Гданьска мы ад'язджалі ў рамантычным настроі. Раней, разам з сябрамі, гасцявалі ў доме Юркі Аляхновіча. Сын беларускага драматурга жыве па вуліцы *Grodzieńskiej*. — А не ведаеце, дзе раздабыць *Пагоню*? — пытае Аляхновіч. Якраз ідзе рамонт ягонага дома.

— Ja bym chciał Pogoń wmurować przy schodach, — тлумачыць.

Частуюць нас свойскім смакоццем. На стале з'яўляецца халадзец з маладой бульбай.

— А ці можна заказаць у вас літар халадцу? — пытаецца захопленая Лена Глагоўская. — Будзе на падарак для аднаго літаратара.

Гданьскія сюрпрызы прадаўжаліся аж да ад'езду цягніка. Пасля абеду ў Аляхновічаў мы пераехалі ў Сопат на вуліцу Уладзіслава Сыракомлі.

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

На сустрэчу прыйшло больш за сотню ліцэістаў

— Ці паверыце, — кажа Мацей Капацкі, — што мой першы артыкул у „Ніве” быў пра Сыракомлю? Вось зараз і жыву на ягонай вуліцы.

Мацей жыве над палітыкам Дональдам Тускам. Пару крокаў ад Балтыкі.

— Пакажу вам свае скарбы, — кажа наш ніўскі прыяцель і перад намі — гістарычныя пагоны з Пагоняй. Гэта памятка па бацьку, генерале беларускага войска Гасане. — А гэта мой святы куточак, — Мацей паказвае на паліцу, дзе красуюцца віленскія здымкі. Тут жа і Еўфрасіння Полацкая, і малітоўныя словы з Карана. Поўны Еўрасаюз!

* * *

Нашы гданьскія сябры — Мацей і Лена — зафундавалі яшчэ шпацыр берагам мора. На сопацкім моле раптам вітае нас зорчын выхаванак, ужо студэнт. Ну так...

Недахоп гадзіннікаў і тэлефонаў цешыў нас як ніколі. Праз акно нашай гасцінічкі, якая размяшчаецца на падстрэшку бібліятэкі імя Джозефа Конрада, час паказваў нам гадзіннік на вежы Марыяцкага касцёла.

Ганна Кандрацюк

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Сыны выдатных беларусаў: Данель Дзекуць-Малей (баптыст), Мацей Канапацкі (мусульманін), Юры Аляхновіч (католік)

— Праект накіраваны да ліцэйскай моладзі з трыгарада Гданьск-Гдыня-Сопат. Ліцэісты знаёмяцца з творчасцю і асобай Джозефа Конрада, а таксама з культурай нацыянальных меншасцей, якія пражываюць у Польшчы. Сустрэліся ўжо з немцамі, літоўцамі, татарамі, жыдамі...

Сярод паломнікаў было шмат моладзі. Ішлі вучні, якія паспяхова справіліся з экзаменамі на атэстат сталасці і старэйшыя асобы, якія нягледзячы на свае хваробы ахвяраваліся пехатою зайсці на святое месца...

З малітвамі за святой вадой

У гэтым годзе на святкаванні, якія праходзілі ў Крыначцы ў трэці дзень Святой Тройцы (1 чэрвеня), прыбылі леснікі і лясныя работнікі. Падарылі яны праваслаўным прыходам распаложаным на тэрыторыі Белавежскай пушчы іконы святога Еўстафія Плаціды, які жыў у другім стагоддзі і лічыцца ахоўнікам лясных работнікаў. На Літургію, якую ўзначальваў мітрапаліт Варшаўскі і ўсяе Польшчы Сава, прыбылі святары і праваслаўныя вернікі з усёй Беласточчыны, прыехалі паломнікі з польскіх гарадоў і Беларусі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

На другі дзень святкаванняў з царквы выйшла паломніцтва ў Крыначку

У першы дзень Святой Тройцы вернікі з Гайнаўшчыны сабраліся ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, дзе пасля Літургіі маліліся за сашэсце Святога Духа. На другі дзень святкаванняў з гэтай царквы выйшла паломніцтва ў Крыначку, якое вёў апякун Брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія протаіерэй Славамір Хвойка. Сабраныя неслі харугвы, іконы ды спявалі царкоўныя песні. Сярод паломнікаў было шмат моладзі. Ішлі вучні, якія паспяхова справіліся з экзаменамі на атэстат сталасці і старэйшыя асобы, якія нягледзячы на свае хваробы ахвяраваліся пехатою зайсці на святое месца. Па дарозе да паломнікаў далучаліся вернікі з іншых гайнаўскіх парафій. Гайнавяне спынялі машыны і прапускалі паломніцтва. Вернікі выйшлі раней, каб трапіць у Крыначку перад патокам машын, якія дабіраюцца на святое месца да ўсяночнага багаслужэння.

Сёлета служба аховы лесу і лясныя работнікі кіравалі рухам машын у лесе ды арганізавалі іх вяртанне ў Гайнаўку аб'язнымі дарогамі. Людзі пакінулі аўтамабілі на вялікай паляне перад царкоўнай агароджай, а плот з другога боку аставілі веласіпедамі. Многія вернікі адразу адпраўляліся да калодзежа пабудаванага на даўняй крынічцы і набіралі асвячонай вады, каб завезці яе сваім сямейнікам, самі ж цудадзейнай вадой абмывалі твар ды хворыя месцы. Многія пакідалі хустачкі, якімі выціралі цела, на калючым плоце, што аддзяляе святое месца ад вайсковай часці. Вады не хапіла тым, якія прыйшлі апошнімі. Яшчэ звыш дзесяці гадоў раней вакол калодзежа была дрыгва ды ўзнімалася адтуль мноства камароў. Камары дакучалі і сёлета, але балоты высахлі і таму ў калодзежы ўсё менш вады.

На трэці дзень Святой Тройцы на Літургію прыбылі жыхары вёсак, якія вечарам займаліся сваёй жывёлай. Яны маглі набраць свежую ваду, якая за ноч сплыла ў калодзеж. Вернікі не мясціліся на царкоўнай плошчы ды стаялі за драўляным плотам. Побач іх размясціліся манашкі з Мінска, якія прадавалі царкоўную літаратуру і іконкі. Пасля малітваў лясныя работнікі, якія падарылі іконы, прасілі святароў і вернікаў маліцца за людзей, што працуюць у лесе.

У мінулым вернікі пасля богаслужэння ў царкве елі абед побач сваіх вазоў і толькі тады адпраўляліся ў дарогу. Апошнім часам толькі некаторыя рашаюцца абедаць у сваіх машынах. Гайнавяне запрашаюць знаёмых у госці. У квартале Мазуры, дзе жыве многа праваслаўных, арганізуецца беларускі фэст „Крыначка". Сёлета выступілі на ім калектывы „Знічка" з гайнаўскага белліцэя , „Heaven" з Гайнаўкі, „Лучына" з Беластока і „Куранты" з Бельска. Паколькі было прыгожае надвор'е, публікі пашанцавала.

Аляксей Мароз

Бачыў больш, чым іншыя

Так аб кінааператару Міколу Нестаровічу (1941-2003) сказаў Анджэй Фідык — вядомы польскі кінарэжысёр-дакументаліст. Гэтая рыса лягла ў аснове яго аператарскага і журналісцкага майстэрства, якое выявілася ў больш за 300 дакументальных і мастацкіх фільмах ды тэлесерыялах.

Мікалай Нестаровіч працаваў з тэлекамерай з 1971 года, але ўвесь час не расставаўся з фотаапаратам, з якім пасябраваў яшчэ ў падставовай школе. Пачаткова папулярным савецкім апаратам здымаў арлянскіх сяброў. Як успамінае сваяк фотамастака Васіль Ляшчынскі, Мікалай Нестаровіч, тады фатограф-пачатковец, так захапіўся фатаграфаваннем, што змарнаваў некалькі ролікаў фотаплёнкі, каб зняць кроплю малака, якая распырскваецца падаючы на паверхню малочнай вадкасці.

З 1981 г. Мікалай Нестаровіч працаваў аператарам на Польскім тэлебачанні, супрацоўнічаў з тэлекампаніямі Бі-бі-сі, Дыскаверы, ВДР, АРТЭ, НГК, здымаў фільмы на ўсіх кантынентах. Гэта дало яму магчымасць стварыць унікальную калекцыю фатаграфій жанчын з усяго свету. Першая прэзентацыя жаночых фатаграфій адбылася на зломе 2003/2004 гг. у Музеі Ігнацы Падарэўскага ў Варшаве. Другая выстава адкрылася 18 чэрвеня ў Ратушы ў Бельску-Падляшскім. Экспануюцца на ёй паўтары сотні фотаздымкаў жанчын — розных колераў скуры, радасных і сумных, за працай і ў час адпачынку, напаўадзетых і ў ваеннай форме, маладых і старэч. У адным з апошніх інтэрв'ю аўтар сказаў: „Ніводнай з іх я не ведаў асабіста. Не ведаю іх імён, не ведаю хто яны такія і чым займаюцца. Часта здымаў іх з укрыцця". Вернісажу спадарожнічала дэманстрацыя кінакарціны Тамары Саланевіч „Жэртва", якую здымаў Мікалай Нестаровіч. На выстаўцы ў адной вітрыне паказваюцца абрадавыя маскі — трафеі з пабыўкі аўтара ў экзатычных краінах, а ў другой — памяткі аб ім: фотаапараты, журналісцкія білеты, дакументы.

Бельская выстава фатаграфій заўчасна памерлага мастака адбылася дзякуючы дапамозе сям'і і сяброў. Ганаровы патранат над мерапрыемствам узяў бурмістр Бельска, а медыяльны патранат трымае м.інш. „Ніва". Спонсарамі выступілі больш за дзесятак бельскіх фірмаў. Выстава „Жанчыны свету" будзе працаваць да канца верасня г.г.

Віталь Луба

Мікалай Ігнацюк 1931-2004

Фота МІКОЛЫ ВАЎРАНЮКА

Усё менш у нас такіх людзей. Дзяцінства Мікалая Ігнацюка з Рыбал выпала на гады вайны. Гэта пазбавіла яго магчымасці закончыць добрыя школы. Але не пазбавіла здольнасці самастойна думаць, не зачыніла вачэй на вонкавы свет, не заглушыла яго прыродных талентаў.

Мікалай Ігнацюк быў шырэй вядомы як актыўны сябра мужчынскага калектыву „Хлопцы-рыбалоўцы". Найчасцей гэта яго песні спявалі суседзі-аднавяскоўцы. Складаў ён мелодыі, пісаў словы. Многа з іх загубілася ў недасканалай людской памяці. Але дваццаць запісаў Сцяпан Копа, апрацаваў музычна і ў 1991 годзе выдаў невялічкай кніжачкай „Мая зямля" (выдавец: Ваяводскі асяродак анімацыі культуры ў Беластоку). Загаловак добра паказвае, што было галоўнай крыніцай натхнення Мікалая Ігнацюка. Пісаў ён пра прыроду, звяртаўся да фальклорных матываў, гістарычных падзей на роднай зямлі (асабліва вайны). Пісаў пра трагічнае і камічнае, пра каханне, якое ў яго заўсёды было асаджанае ў рэаліях падляшскай беларускай вёскі. Пісаў на беларускай літаратурнай мове і на дыялекце сваёй вёскі.

Але не толькі паэтычна-музычнымі летуценнямі жыў гэты гаспадар з дзеда-прадзеда. Трымаўся ён цвёрда сваёй роднай зямлі, якую апяваў, але перш-наперш — абрабляў. Двухпавярховая мураванка ля аўтобуснага прыпынка доказам таго, што быў ён добрым гаспадаром. Прычым, хапала ў яго сілы, каб займацца не толькі сваімі справамі, але і грамадскімі. Быў актыўным пажарнікам-добраахвотнікам, заўсёды спяшыў з дапамогай у бядзе. Стараўся, каб вёска жыла. Змагаўся ў гміне ў Заблудаве за захаванне вясковага дома культуры. І сёння гэта, бадай, адзіны так актыўны культурны асяродак у вёсцы на ўсёй усходняй Беласточчыне.

— Адышоў чалавек, які трывала запісаўся ў жыцці нашай вёскі, прыхода, грамадскасці, — успамінае пакойнага Мікалая Ігнацюка айцец Рыгор Сасна, настаяцель праваслаўнага прыхода ў Рыбалах. — Адораны моцным голасам і добрым музычным слыхам пеўчы, душа „Хлопцаў-рыбалоўцаў", ініцыятар большасці вясковых мерапрыемстваў, пачынаў. Выдатная асоба. Хоць без фармальнай адукацыі, але з талентам ад Бога, розумам і паслядоўнасцю ў ажыццяўленні пастаўленых сабе мэтаў.

Аднае не паспеў ажыццявіць. Не дачакаў устанаўлення помніка каля ракі Нарвы, дзе ў 1941 годзе загінула некалькі соцень чырвонаармейцаў, пераважна хлопцаў з навакольных вёсак. Дзесяцігадовы Мікалай бачыў, як іх хавалі. Гэты вобраз хадзіў за ім да апошніх хвілін. Калі ў мінулым годзе ўзнікла ініцыятыва ўшанаваць загінуўшых, уключыўся ў яе, хоць са здароўем было ўжо не найлепш. Падабраў нават палявы валун, на якім хацеў выцясаць страфу са сваёй песні пра страшны бой над Нарвай...

М. В.

Сайт прысвечаны адной вузка скіраванай тэматыцы — беларускім замкам на малюнках Драздовіча...

drazdowicz.narod.ru



Экскурсіі па разнастайных карцінных галерэях заўсёды лічыліся карысным баўленнем часу. На вернісажах і ў музеях наведвальнік не толькі актыўна адпачывае ад уласных паўсядзённых праблем, але і знаёміцца з пунктам погляду на рэчаіснасць іншага чалавека, г.зн. мастака. Адначасова паглыбляецца эрудыцыя, веды па той ці другой галіне, чалавек адкрывае для сябе нешта новае, дагэтуль нязнанае.

Тое самае можа адбыцца і з карыстальнікам Інтэрнэту, калі ён набярэ на сваім камп'ютэры адрас http://drazdowicz.narod.ru. На маніторы адразу высвеціцца някідкі чорна-белы партрэт выдатнага мастака Язэпа Драздовіча з яго аўтографам.

Сайт прысвечаны адной вузка скіраванай тэматыцы — беларускім замкам на малюнках Драздовіча.

Ніжэй загалоўка сайта ідуць невялікія здымкі тых самых замкаў ці таго, што ад іх засталося з невялікім, у адзін сказ, апісаннем. Практычна ўсе пералічаныя замкі, замчышчы, брамы і вежы знаходзяцца на заходняй тэрыторыі Беларусі, таму жыхарам Падляшша не так далёка будзе, пры жаданні, наведаць тыя мясціны, якія ўвасобіў на палотнах мастак.

Адкрывае спіс замак Сапегаў у Альшанах. Малыя малюнкі лёгка павялічыць да займаючага амаль паўманітора выяўлення адпаведнай карціны Язэпа Драздовіча. Але чамусьці гэтыя самыя малюнкі павялічваюцца, значыць, адкрываюцца наноў не надта хутка. Сядзець і чакаць пакуль патрэбнае выяўленне адкрыецца прыходзіцца каля 2-3 хвілін. Згаданы Альшанскі замак прадстаўлены чатырма карцінамі намаляванымі ў 1929 г.

Наступны раздзел змяшчае вобразы замка ў Крэве. Сярод карцін — руіны замка, парэшткі муроў, часткі замчышча і некаторыя іншыя выявы. Малюнкаў з Крэва найбольш у параўнанні з іншымі прадстаўленымі мясцінамі.

Замак у Лідзе, а дакладней яго руіны, выглядаюць больш захаванымі. Цяжка сказаць ці маюць яны на сёння той самы выгляд, які мелі ў 20-30-я гады мінулага стагоддзя, але нават калі ўсё змянілася не ў лепшы бок, згадаць, што было ў тыя часы не цяжка, дзякуючы ў тым ліку і творам Драздовіча.

Замак у Медніках, сучасным памежным з Беларуссю пункце на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі, прадстаўлены толькі агульным выглядам руін. Шкада, канешне, што ад былой летняй рэзідэнцыі князёў Вялікага княства Літоўскага амаль нічога не засталося.

Найбольш захаваным, дарэчы, і дагэтуль з'яўляецца замак у Міры. Старажытныя муры і вежы, як і само мястэчка прадстаўлена чатырма цікавымі карцінамі.

А вось ад замка ў Навагрудку, колішняй сталіцы старадаўняй беларускай дзяржавы, амаль нічога не засталося. Найбольшую цікавасць прадстаўляюць тры апошнія карціны руінаў замка і самога Навагрудка ўзору 1929 г., якія маюцца ў каляровым выяўленні.

Па праглядзе ўсіх твораў мастака інтэрнэтны вандроўнік можа пазнаёміцца больш падрабязна з біяграфіяй Язэпа Драздовіча на англійскай і беларускай мовах. Цікава, што гэтыя два варыянты не з'яўляюцца моўнымі копіямі адзін аднаго, з чаго трэба разумець, што распрацоўшчыкі сайта хацелі, каб абедзве версіі нібыта дапаўнялі адна адну.

Уладзімір Лапцэвіч

Ягор Мешчаракоў, Андрэй Крыванос, Аляксандр Куль скончылі амерыканскія універсітэты і марылі выступаць у мацнейшай лізе свету. Але прабіцца ў NBA...

Беларусь, беларусы...

Каманда, якая „не вырасла"

У 1994 годзе беларуская баскетбольная дружына сенсацыйна стала чэмпіёнам Еўропы сярод моладзевых каманд. Такі поспех стаў найбольшым дасягненнем айчыннага спорту ў гульнёвых камандавых відах. Зусім нядаўна ў Мінску адсвяткавалі дзесятыя ўгодкі той перамогі. Юбілейная вечарына падчас міжсезоння прайшла ў цёплай атмасферы, але навеяла сум.

На жаль, „залатая" каманда пасля чэмпіёнскага трыумфу нічога не здолела дасягнуць на дарослым роўні і праз гады папросту расцярушылася па свеце. Зараз у Беларусі працуе толькі тагачасны галоўны трэнер Аляксандр Барысаў, ды выступае ў складзе „Гродна-93" абаронец Аляксей Пынцікаў. Астатнія даўно за мяжой. Генадзю Кузняцову і Алегу Юшкіну нават не афармілі беларускага грамадзянства, зараз яны жывуць на Украіне. З Францыі на юбілей прыехалі Аляксандр Радзівонаў і Аляксандр Лабажэвіч, з Ізраіля — трэнер Міхаіл Тайц. З'явіўся і выхаванец гродзенскага баскетбола Аляксей Альшэўскі, які гадоў восем таму прыняў польскае грамадзянства і пераехаў на сталае жыхарства ў Беласток. Да слова, у Польшчы пасля ўдалых выступаў за клубы даўно аселі і ранейшыя лідэры зборнай Беларусі Ігар Грышчук і Сяргей Жалудок.

Найбольшыя надзеі ўскладаліся на трыо Ягор Мешчаракоў, Андрэй Крыванос, Аляксандр Куль. Хлопцы ў свой час скончылі амерыканскія універсітэты і марылі выступаць у мацнейшай лізе свету. Але прабіцца ў NBA так і не здолелі. Магчыма, першым беларусам у запаветнай лізе ў бліжэйшы час стане самародак Уладзімір Верамеенка, які апошні сезон выступаў у Расіі. Што тычыцца Мешчаракова, Крыванаса і Куля, то яны багата паездзілі па Еўропе, выступалі за розныя клубы сярэдняга роўню. Кар'еры здольных баскетбалістаў па вялікаму рахунку не склаліся, замучылі і траўмы. Асабліва прыкра за цэнтравога Куля, вядомага патрыятычнымі настроямі. Антрапаметрычныя даныя Аляксандра ўражвалі спецыялістаў, але цэлы комплекс прычын не дазволіў яму рэалізаваць свой патэнцыял.

Беларускі мужчынскі баскетбол зараз у гаротным стане. Гэта хакей мае сур'ёзную дзяржаўную і спонсарскую падтрымку. І калі хакеісты, футбалісты, гандбалісты маюць міжнародны гульнёвы каляндар, то баскетбалісты такой практыкі пазбаўлены. У краіне па сутнасці толькі адзіны сур'ёзны клуб — „нязменны" чэмпіён Беларусі „Гродна-93". Ды і той перажывае не лепшыя часы, не здолеўшы заявіцца апошні сезон у розыгрыш еўракубка. Зборная, аснову якой па-ранейшаму складаюць „выпускнікі" 1994 года і якую трэніруе той жа Аляксандр Барысаў, так і не здолела аднавіць псіхалогію пераможцаў. Усе апошнія адборавыя турніры беларуская дружына праваліла. У апошняй кваліфікацыі здолелі перамагчы і апярэдзіць толькі суседзяў-палякаў. Цяпер жа, пасля рэформы ў еўрапейскім баскетболе і падзелу нацыянальных каманд на дывізіёны, Беларусь апынулася ў другой лізе. Выбрацца з яе наверх мусіць яшчэ гэтае пакаленне. Пакаленне, якое стала моладзевым чэмпіёнам Старога свету, але так і „не вырасла".

Уладзімір Хільманович

Занатоўкі кантрабандыста

Парабак

Толькі прыдурак мог сцвярджаць, што эксплуатацыя чалавека чалавекам прыдуманая пануючымі класамі. Алік Гартанюк ніколі да такіх класаў не належаў. Ён быў самым звычайным кантрабандыстам. Як вядома з тэорыі класавай барацьбы, кантрабандысты ўвогуле ні да якіх класаў не належаць, а слова эксплуатацыя калі недзе і чулі, то даўно забыліся што яно азначае. Алік, як і ўсе двухногія на гэтым свеце, што цяжка зарабляюць сабе на хлеб, проста марыў трошкі адпачыць. Але каб пры гэтым заставаўся ўсё той жа стабільны прыбытак, які і дае ўпэўненасць у заўтрашнім дні, вырашыў наняць працаўніка. Кніжак з разумнымі тэорыямі ён не чытаў. Таму нават зялёнага разумення не меў пра сістэму наёмнай працы, легальны бізнес і абарону правоў працоўных. Дый навошта яму гэта было. Якія ў працоўнага чалавека правы, ён добра спазнаў, калі першы раз перасякаў польска-беларускую мяжу, каб купіць у Беларусі тэлевізар „Гарызонт" з пультам. Іх тады толькі сталі рабіць і прадавалі выключна па талонах. Адзін на пяць гадоў. Гартанюк вельмі марыў набыць такую рэч. У думках ужо бачыў сваіх шчаслівых дзетак каля новенькага каляровага экрана. Ды вось не пашанцавала. Мытнікі сканфіскавалі ўсе грошы, якія зарабляў цэлае жыццё, цяжка працуючы на заводзе. Валюту тады забаранялі перавозіць. А адкуль гэта мог ведаць няшчасны беластоцкі беларус. З тае пары Алік кінуў завод і пайшоў у кантрабандысты. Каб зарабіць на ўсё той жа тэлевізар. Праз дзень ужо ведаў, што калі перавозіш грошы, то іх трэба хаваць. Праз два дні ведаў дзе хаваць. А праз год у кожным пакоі ягонай чатырохпакаёвай кватэры ў Беластоку стаяла па тэлевізары. Ды не „Гарызонты", а „Соні" ды „Філіпсы". І ўсе з пультамі.

— Што мы ўсё гарбы сабе нажываем? — пытае ён у мяне. — Круцімся на гэтай мяжы як вошы на грабяні. Нават паглядзець тэлевізар няма калі. Як я працаваў на заводзе, кожны вечар быў вольны. Але не было тэлевізара. Зараз тэлевізараў цэлая куча, а няма часу іх глядзець. Таму і надумаўся наняць парабка. У мяне дзед быў. Меў ля Саколкі колькі гектараў зямлі. Дык ён, каб мажлівасць здабыць на кірмаш з'ездзіць, ці яшчэ якога ражна ў жыцці пашукаць, наняў парабка. Той гаспадарку дагледжваў, пакуль дзед адсутнічаў. І пагаварыць з кім было дзеду па прыездзе. Хіба і нам трэба яго досведу трымацца. А то зусім здэградуем ад такой працы.

— Каго тут знойдзеш? — кажу яму. — Цяпер усе хітрыя сталі. Абдзяруць нас як ліпу, ды наўцёкі. Я не ведаю такога чалавека, якому свой бізнес раскрыў бы.

— Я ведаю, — угаворвае мяне Алік. — Да мяне даўно напрошваецца адзін паляк, Янак. Ён надумаўся жаніцца, а грошай на вяселле няма. Кажа, дай зарабіць. Не пашкадуеш, маўляў. У самога грошай на спірт няма. То хай возіць наш. А мы яму трохі заплацім. Хопіць нам, беларусам, вечна на пана працаваць. Хай цяпер паляк на беларусаў папрацуе.

Я пагадзіўся. І нават, як упершыню пабачыў Янка, не адчуў небяспекі. Хлопец малады, з выгляду сумленны і працавіты. Чаму такога не ўзяць у парабкі.

Алік наладаваў машыну спіртам, дзе толькі было мажліва — у дзверках, пад капотам і нават у запасным коле. Гартанюк парабку паставіў канкрэтную задачу — давезці тавар да Беластока, раскруціць машыну, дастаць спірт, аддаць яго і ўзяць у Алікавай жонкі грошы на закупку наступнай партыі кантрабандnага спірту. Адну бутэльку даў у рукі. Маўляў, яе можна перавезці легальна. Вось гэта і была галоўная памылка. Праз гадзінаў сем вярнуўся Янак. П'яны як дзіравы бот з левай нагі. Лыка не вяжа. Толькі просіць прабачэння за тое, што літруху выпіў. Але сцвярджае, што пастаўленую задачу выканаў. Прывёз ад Алікавай жонкі грошы.

— А спірт аддаў маёй жонцы? — пытае Алік.

— Які спірт? — перапытвае Янак.

Гартанюк, нічога не кажучы, раскруціў дзверкі машыны, а там, блішчаць бутэлечкі са спіртам. Янак на машыне, за якую была заплачана страхоўка і ўсе астатнія кошты для пераезду праз мяжу, завёз кантрабандны тавар у Польшчу і прывёз яго назад. Пры гэтым двойчы, нашым коштам, рызыкаваў канфіскацыяй машыны.

— Ну што, — кажу, — Алік. Дапамог нам твой парабак, як некалі дапамагаў твайму дзеду?

— Вінаваты я перад табой, — кажа ён.— Я галоўнага табе не сказаў, што дзед распавядаў пра парабкаў. Чужымі рукамі, казаў ён, толькі жар заграбаць. Мы пасмяяліся і з той пары больш не спрабавалі наймаць парабкаў. Працавалі сваім гарбом.

Сымон Нальшанскі

ТУРЫСТЫЧНЫЯ СЮРПРЫЗЫ

Многія мараць аб далёкіх падарожжах у цёплыя краіны, гарачым сонцы, наведванню новых, цудоўных месцаў. Разам з уваходам Польшчы ў Еўрасаюз маем магчымасць падарожнічаць па ўсіх краінах нашага кантынента, а канікулы гэта найлепшы час на супольныя сямейныя выезды. Варта, аднак, загадзя даведацца аб звычаях еўрапейскіх суседзяў, каб пазбегчы непрадбачаных сюрпрызаў. Паможа нам у гэтым Анна ТКАЧУК — экскурсавод.

— Цікавай і таннай для падарожжаў з'яўляецца Чэхія. Ці там могуць чакаць нас сюрпрызы?

— Можа здацца, што не, але гэта няпраўда! Многія палякі лічаць, што чэшская мова простая і падобная на польскую, што размова з чэхамі не прынясе ніякіх праблемаў. Аднак існуе шмат моўных пастак, якія могуць прывесці да камічных сітуацый. „Laska nebeska" абазначае вялікае каханне, „czerstwy" (čerstvy) у адносінах да хлеба абазначае свежасць хлебабулачных вырабаў, „krabiczka" (krabička) гэта не самка краба, а толькі невялікая каробка, „piwnica" (pivnica) — гэта піўная, „motylek" гэта рэдка ўжываная нашымі мужчынамі бабачка да касцюма. Такіх слоў намнога больш і то не толькі ў чэшскай мове, бо, напрыклад, італьянскае слова „curva" абазначае паварот дарогі.

— Большасць жанчын марыць аб паездцы ў гарачую Італію, Грэцыю або рамантычны Парыж. Што трэба ведаць выбіраючыся ў названыя месцы?

— Перад падарожжам трэба пазнаёміцца хаця крыху з гісторыяй краіны, якую намерваемся наведаць. А сюрпрызы чакаюць нас і ў Францыі, і ў Італіі. Трэба ведаць, што не выпадае прасіць француза аб соль, перац ці іншыя спецыі, бо яны лічаць сябе найлепшымі кухарамі свету. Такая просьба гэта вялікая нетактоўнасць! Выбіраючыся ў Італію мусім памятаць, як жанчыны, так і мужчыны, што ў месцах рэлігійнага культу нельга паказвацца ў шортах ці кароткай спадніцы (павінна яна сягаць палавіны лытак), або ў доўгіх нагавіцах і з акрытымі плячыма. У Грэцыі не раю падымаюць угару вялікі палец. У нас гэта станоўчы знак, выраз адабрэння, а ў Грэцыі — наадварот (палічаць нас тады невыхаванымі прасцякамі). Італьянцы, пабачыўшы прыгожую жанчыну, пачынаюць голасна цмокаць, падымаюць высока рукі, апладзіруюць, што некаторым можа здацца абразай.

— Гэта праўда?! Але, напрыклад, у Англіі турыстаў не спаткаюць падобныя сітуацыі?

— Спаткаюць, нават яшчэ смяшнейшыя! Англія надалей здзіўляе сваімі звычаямі. Напрыклад, вокны, якія адчыняюцца не да сярэдзіны а на вонкі, або чэргі, якія выстрайваюцца перад уваходам у аўтобусы. Таго не пабачым на нашых аўтобусных прыпынках. У Англіі ў аўтобус уваходзяць пярэднімі дзвярыма толькі тады, калі прыйдзе чарга! Другім прыкладам могуць быць асобныя краны з гарачай і халоднай вадой у ваннах, дзе каб атрымаць летнюю ваду трэба закрыць адліў, адкруціць абодва краны і пачакаць аж вада змяшаецца.

— Што яшчэ можа задзівіць нашага турыста ў час падарожжаў па краінах Еўрасаюза?

— Я не ў змозе пералічыць усе кур'ёзы. Кожная краіна мае свае спецыфічныя звычаі, жэсты. У Балгарыі круцячы на „не" галавой пацвярджаем нешта, бо нашае „не" гэта балгарскае „так"! Балгары прыхільна настаўлены да турыстаў, часта цалуюць іх па твары, абдымаюць, гладзяць, а гэта не кожнаму падабаецца. Калі жанчына выбярэцца разам з мужчынам у рэстаран у Марока, афіцыянт паставіць толькі адну талерку перад мужчынам! Паводле іхніх звычаяў, сужонства дзеліцца ўсім, нават стравай! Не шукайма ў Іспаніі ці Францыі попельніцы ці сметніцы, бо там усё можна кінуць на зямлю! Здзіўленне ў турыстаў выклікае дадаванне італьянскімі барменамі да заказанай намі гарачай кавы халоднай вады або кубікаў лёду. Ніхто не паверыць, што маем ахвоту выпіць кіпень. Нельга абражацца, што італьянцы глянуць на нас са спачуваннем, калі закажам у рэстаране гарбату, бо там чай п'юць толькі хворыя людзі. Танней заплацім за гарбату ці каву, калі не сядзем за сталом, а вып'ем іх стоячы каля прылаўка. У Харватыі заказваючы гарбату трэба афіцыянту выразна сказаць, што хочам, напрыклад, чорную, у іншым выпадку атрымаем фруктовую гарбату. А англічане да добрага чаю даліваюць малако! Трэба быць асцярожным! Жадаю прыемных падарожжаў!

— Дзякую за размову!

Гутарыла Паўліна Шафран-Асташэвіч

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Маладая жанчына (27 гадоў) з вопытам, гандлёвы прадстаўнік, без дрэнных схільнасцей, працавітая, правы кат. В, добрае веданне камп'ютэра, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 0 694 957 365.

• Жанчына (47 гадоў) з вопытам кіраўніка магазіна, сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 508 753 167.

• Малады мужчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, вадзіцельскія правы кат. В, шукае працу ў Бельску-Падляшскім, тэл. 0 501 588 635.

• Студэнт-завочнік шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, уласная машына (малюх), абслуга камп'ютэра, працавіты, не баіцца ніякай працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 604 561 787.

• Інжынер-будаўнік (30 гадоў), вышэйшая адукацыя, будаўнічыя правы, неадкладна патрабуе працу ў ваколіцах Бельска-Падляшскага, тэл. 0 508 628 196.

• Малады мужчына (26 гадоў), гандлёвы прадстаўнік — прадукты будаўнічай і хімічнай спецыяльнасцей, сярэдняя адукацыя, камунікатыўны, правы кат. В, уласная машына, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 508 628 196.

• Маладая жанчына, вышэйшая педагагічная адукацыя, правы кат. В, добрае веданне нямецкай мовы, шукае працу ў Падляшскім ваяводстве, тэл. 0 608 651 478.

• Студэнтка-завочніца шукае працу ў Беластоку, найлепш у ранніх гадзінах, добрае веданне рускай мовы, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 694 540 776.

• Жанчына (25 гадоў), спецыяліст па справах маркетынгу і продажу — вышэйшая адукацыя, веданне камп'ютэра, добрае веданне рускай мовы і тэхнічнай тэрміналогіі, пільна шукае працу, тэл. 0 503 713 915.

• Жанчына з вопытам у гандлі, шукае працу ў Беластоку, тэл. 654 41 65.

• Прадавец (34 гады), сярэдняя адукацыя, веданне камп'ютэра, англійскай мовы, правы кат. В, патрабуе працу ў Гайнаўцы, тэл. 0 651 096 880.

• Мужчына, сярэдняя адукацыя, вопыт у будаўнічых працах, правы кат. В, без дрэнных схільнасцей, пільна патрабуе працу ў Беластоку або ваколіцах, тэл. 0 694 771 389.

• Малады мужчына (29 гадоў), з вопытам (гандлёвы прадстаўнік), вышэйшая юрыдычная адукацыя, уласная машына, тэл. 0 694 744 998.

• Мужчына (37 гадоў), механік з вопытам шукае працу ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, С, тэл. 0 604 960 657.

• Мужчына з Беластока, муляр, вопыт за мяжой, без дрэнных схільнасцей, тэл. 0 509 962 778.

• Маладая жанчына, вышэйшая эканамічная адукацыя, стаж працы ў гандлі, веданне камп'ютэра і абароту гандлёвых дакументаў, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 697 754 188.

• Жанчына (42 гады), шукае працу ў ваколіцах Старасельцаў, танна прыбярэ, зварыць, заапякуецца дзіцём або старэйшай асобай, тэл. 710 90 03.

• Выпускніца сацыялогіі шукае працу ў Беластоку, абслуга камп'ютэра, санітарны мінімум (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 698 285 964.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 730 20 06

• Сям'я патрабуе пледаў, адзення для дзяцей ва ўзросце ад 5 да 13 гадоў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе дзіцячага адзення, пасцелі і яды.

• Самотная маці з хворым дзіцём будзе ўдзячна за ўсякую помач.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 5, 8, 11 гадоў будзе ўдзячна за любую помач.

• Сям'я патрабуе старога халадзільніка.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я патрабуе старой мэблі і летняга адзення, для дзяцей ва ўзросце 7 і 9 гадоў.

• Сям'я, якая выхоўвае пяцёра дзяцей, патрабуе летняга адзення для дзяцей.

• Сям'я з дзесяці асоб патрабуе пледаў, пасцелі, лёгкага адзення для дзяцей.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, ды іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Спадарыні ***ГРАЖЫНЕ ХАРЫТАНЮК***
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Яе гора
— смерці Маці —
выказваюць супрацоўнікі Кафедры беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку.

Словы шчырага спачування выказваем
ГРАЖЫНЕ ХАРЫТАНЮК
з прычыны смерці яе шматпакутнай матулі.
Сябры з рэдакцыі „Нівы".

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 600 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

IX Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы” і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб’яўляюць IX Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы.

Тэматыка

Арганізатары не абмяжоўваюць тэматыкі дасыланых твораў. У конкурсе будуць разглядацца працы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— I група: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— II група: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з’яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб’ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 149** з прыпіскай на канверце: IX Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **31 ліпеня 2004 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб’яўлены ў канцы верасня 2004 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі грашовыя і рэчавыя ўзнагароды. Дапускаюцца таксама ўсялякія іншыя ініцыятывы арганізацый і прыватных асоб з мэтай павелічэння колькасці ўзнагарод. Арганізатары будуць садзейнічаць такім ініцыятывам.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

3. Журы можа не выкарыстаць усяго фонду ўзнагарод.

4. Арганізатары прадугледжваюць магчымасць публікацыі ўзнагароджаных твораў (без права аўтараў на гонарары) на старонках „Нівы”, у агульнапольскім друку і па радыё.

Заключныя заўвагі

1. Працы, якія не адпавядаюць правілам конкурсу, не будуць разглядацца.

2. У справах, якія вынікаюць з супярэчлівага тлумачэння правілаў, канчатковае рашэнне выносяць арганізатары ў паразуменні з журы.

3. Сакратарыят конкурсу: **Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok, tel. 743 50 22.**

Музычныя навіны

11 ліпеня ў Мінску пачынаецца Усебеларускі конкурс маладых музычных талентаў „Muzzone драйв”. У конкурсе павінны ўдзельнічаць усе, хто стварае якую-колечы музыку. Арганізатары абяцаюць пераможцам запісы ў прафесійнай студыі, выданне альбома ды нават відэакліп. Падрабязнасці на http://muzzone.by

XV „Басовішча” ўсё бліжэй — 23-24 ліпеня 2004 г. Абвестка ўсім, хто спявае па-беларуску. У час фэсту плануецца гэтак званая „адкрытая сцэна”. Гэта значыць, што калі ў вас ёсць жаданне, а вы альбо не патрапілі ў спіс намінантаў, альбо ў вас не атрымалася своечасова даслаць матэрыял арганізатарам, можаце прыехаць за свой кошт ды выступіць. Журы будзе ацэньваць таксама „адкрытую сцэну” ды, магчыма, галоўны прыз трапіць акурат вам. Інфармацыя: www.basowiszcza.org

Татка Стэп

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Паліцыянты перад важнай акцыяй атрымалі загад, каб з дому забраць толькі асабістыя рэчы. У вызначаны час адзін з іх прыносіць з сабою дзвярны вушак.

— Быў жа загад, — папракаюць яго, — каб забраць толькі асабістыя рэчы...

— А чым я буду адкрываць піва?

* * *

— Татка, — пытае сынок бацьку, — што гэта бігамія?

— Гэта такі выпадак, калі чалавек мае на адну жонку замнога.

— А манагамія?

— Гэта тое самае.

* * *

Узбураны прафесар прыносіць праверaныя працы студэнтаў:

— Усе ідыёты няхай устануць! — загадаў.

Настала цішыня, ніхто не варушыцца. Праз нейкі час устае адзін студэнт.

— Вось бачыце! — трыумфуе прафесар. — Чаму лічыце сябе ідыётам?

— У сапраўднасці гэта не я, толькі мне стала няёмка, што спадар прафесар стаіць сам.

* * *

Паліцыянты дарожнай інспекцыі запыняюць машыну і просяць у шафёра дакументы.

— Толькі не трымайце мяне занадта доўга, — просіць вадзіцель, — бо праследуюць мяне вашы сябры.

* * *

Паліцыянт запыняе разагнанага шафёра:

— А ну, падуйце ў гэты шарык!

— Ці трэба гэта рабіць?

— А што: хочаце, каб гэта за вас зрабіў я? Тады напэўна страціце вадзіцельскія правы.

* * *

Месяц пасля шлюбу маладая Аня звоніць мацеры:

— Мамачка, страшэнна пасварылася я з Андрэем...

— Не хвалюйся празмерна, напачатак здараецца гэта многім сужонствам. Гэта невялікая праблема.

— Сапраўды? А што мне зрабіць з ягоным целам?

Адгаданка



1. аўтамабіль, 2. невялікая шэравата-карычневая птушка сямейства вераб’іных, 3. вежа пры мячэці, 4. пагадовы запіс гістарычных падзей, гісторыя, 5. кароткі перапынак для курэння, 6. мабільнае прыстасаванне для засцярогі ад дажджу або сонца ў выглядзе акруглага кавалка тканіны замацаванага на доўгай ручцы пры дапамозе складаных спіц, 7. сусед украінца і літоўца.

(ш)

Рашэнне адгаданкі атрымаецца з літар у светлых клетках, чытаемых зверху ўніз. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 20 нумара

Бетон, гай, дзесяць, жучок, імя, кароль, пяць, ода, сініца, Сож, цыбуля, цэп, чатыры, эра.

Рашэнне: **У калгасе добра жыць: адзін робіць, сем ляжыць, а як сонца прыпячэ, то і той уцячэ.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Мікалаю Лук’янюку** з Бялкоў.

27.06 – 3.07

Баран (21.03. — 19.04.) Асабліва гарачыя дні — будзеш фліртаваць і заварожваць. Расквітнее твая жывасць і творчы патэнцыял. Будзеш цешыцца жыццём, а сябры разам з табою. 26 — 28.06. — знойдзеш аварыйны выхад з хатніх праблем.

Бык (20.04. — 20.05.) Можа дайсці на фоне хатняй звышапякунчасці да дробных сварак, а калі ты Бык народжаны 20 — 26.04. — нават да вялікіх скандалаў. Справішся з даўгамі. Не шкадуй сабе пліткі шакаладу.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Добры настрой падыме спадзяваны прыліў грошай. Сувязі, якія не маглі неяк акрэсліцца, набяруць румянасці. Надшарпнутыя сувязі з сябрамі і сям’ёй маюць шанц паправіцца. Пі шмат вады, сок з крапівы, еш агуркі і кавуны.

Рак (22.06. — 22.07.) Прыліў свежых грошай дазволіць табе зашалець на канікулах. Перадумай сваё жыццё — ці плыве яно так, як ты яго планаваў. Перастань думаць схематычна аб людзях. Добра высыпайся.

Леў (23.07. — 22.08.) 26 — 30.06. Сонца апынецца ў трыгоне да Юпітэра — час шалёных ідэй і нетыповай іх рэалізацыі. Патрэбны табе сябры, з якімі ты павінен сустракацца як найчасцей дзеля разрадкі, яны вернуць табе ахвоту да жыцця і энтузіязм. Новых сяброў знойдзеш сярод маладзейшых ад сябе.

Дзева (23.08. — 22.09.) Апазіцыя Меркурыя да Юно (27 — 30.06.) спрыяе канфліктам у сужонстве і сваркам, у час якіх могуць прагучаць непатрэбныя словы. Спрабуй халодным вокам прааналізаваць пытанні, якія вас розняць.

Шалі (23.09. — 23.10.) Самотныя Шалі могуць разлічваць на любоў. Прыліў энергіі. Некаторыя мерапрыемствы пакінь іх уласнаму бегу. Магчымы дадатковы заробак.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Добрая форма. Змагайся за сваё. Узрасце твой аптымізм. Можаш раптам адчуць, што партнёр цябе глыбока расчараваў, што розніцы паміж вамі завялікія; патрактуй гэту сітуацыю як выклік, з якім варта пазмагацца. Пазбягай стрэсаў, лішку сонца, смажаніны, экстрэмальнага спорту.

Стралец (22.11. — 21.12.) Смела едзь у падарожжа. Будзь разважлівы, знаёмчыся з новымі асобамі. Не даводзь да канфлікту паміж сябрамі і тваёй сям’ёй. Ашчаджай ныркі і пячонку.

Казярог (22.12. — 20.01.) Афармляй важныя справы да 29.06. Маеш магчымасць хутка здабыць грошы. Людзі могуць быць залішне крытычнымі да твае асобы; не пераймайся. Можа, лепш водпуск правесці аднаму? Сонечныя праменні ажывяць тваё цела, Венера дапільнуе красу!

Вадалей (21.01. — 19.02.) Можаш падумаць аб адважных зменах у сваім жыцці. Некаторыя падзеі дома выб’юць цябе з раўнавагі. Добры час лячыць зубы — працэдуры не будуць балесныя.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Выдатны настрой, уцеха ад сустрэч і пазнаных асоб. У сям’і радасць ад кагосьці новага — гэта можа быць новы прыяцель ці сваяк. Маеш сілу на цяжэйшыя заданні, якіх не зрабіў за апошні месяц.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960